Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не варочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Цьмена адрасу: іншагародняя	— 20 к.
місцовыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок наипарэлі пасьля тэксту — р. 56 к.
За радок наипарэлі пасьпроз тэксту 1 р. — к.
За радок наипарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к.
Сьпешныя на 50 проц. дражэй.
Зьыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант . . . 35 кап.
За кожны дадатковы . . 15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . 15 „
За кожны дадатковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 93 (2281) Субота, 21-га красавіка 1928 г.

Упарадкаваньне вёскі і самаабкладаньне

Упарадкаваньне вёскі за апошнія гады зрабіла вялікі крок наперад, але яно ўсё яшчэ ў значнай меры адстае ад нашага агульнага росту.

Тут у нас непачаты край працы. Сельскія і валасныя дарогі вельмі кепскія: раньняю вясною і ўвосені па іх нельга праехаць, масты на іх такія, што вазы ламаюцца і коні калечацца. А адрамантаваць дарогі іншы раз вельмі лёгка. Некалькі дзён працы ўсёй вёскай—і дарога і масты будуць адрамантаваны.

Вельмі часта насельніцтва вёскі п'е нездаровую ваду, між тым невялікія выдаткі сродкаў на студню, ці ўпарадкаваньне сажалкі, ці трэчкі маглі-б даць добрую ваду для піцьця.

Пажарныя абозы ня ўсюды маюць патрэбнае абсталяваньне, а вёска адчувае ў іх вялікую патрэбу, бо яна гарыць вельмі часта.

Без электрычнасьці на вёсцы цяжка гаварыць аб яе ўпарадкаваньні. Вясковыя школы і больніцы патрабуюць рамонту, апалу і інш. дапамогі. Гэтую дапамогу сельскі савет можа арганізаваць.

Нанова выдадзены дэкрэт аб самаабкладаньні сялянства хутка прасуне пытаньне аб палепшаньні ўсяе гаспадаркі на вёсцы. Трэба толькі сваячасова сабраць грошы, сваячасова намеціць тую працу, якую трэба правесьці на сабраныя грошы, больш уважліва падрыхтавацца да працы і лепш і таньней яе выканаць.

Самаабкладаньне праводзіцца, грунтуючыся на магутнасьці кожнае асобнае гаспадаркі, пры ўмове частковага ці поўнага вызваленьня незаможных гаспадарак. Такім чынам, значная частка самаабкладаньня перакладаецца на больш заможныя пласты насельніцтва.

Сродкі, сабраныя па самаабкладаньні, выдаюцца выключна на культурна-гаспадарчыя патрэбы вёскі. У першую чаргу грошы павінны быць выкарыстаны ў сяле, каб сялянскае насельніцтва бачыла, куды і на што трацяцца сабраныя ім грошы.

Дэкрэт катэгарычна забараняе траціць гэтыя сродкі на патрэбы адміністрацыйнага характару (узнагарода працаўнікоў мясцовых органаў улады, разъезды, утрыманьне канцэлярый і інш.).

Выбар працы павінен быць праведзен на сельскім сходзе, а пастановы сходаў будуць накіраваны на разгляды райвыканкомаў.

Усімі сабранымі сродкамі і ўсёю працаю загадвае сельсавет.

Посьпех усяе гэтае вельмі важнае для сялянскае гаспадаркі справы залежыць ад вумелага выбару працы, ад правільнага і эканомнага выдаткаваньня сабраных грошай і ад актыўнасьці самога насельніцтва. Надыходзіць будаўнічы сэзон. **Са зборам грошай і з падрыхтоўкаю да працы трэба сьпяшыць.**

Байкі Хікса аб савецкіх грошах на рэвалюцыю ў Англіі

Крыніцы пахаджэньня інфармацыі Хікса тыяж, што і „ліста Зіноўева".

Запытаньні у палаце вобшчын.

ЛЁНДАН, 19-4. Агенцтва Рэйтэра паведамляе: «Дэпутат палаты вобшчын майёр Кіндэрсьлі (кансэрватар) запытаў у палаце вобшчын міністра ўнутраных спраў, як стаіць справа з расьсьледаваньнем, ці не скарыстоўваюцца грошы, якімі кіруюцца расейскія гандлёвыя арганізацыі, на падбухторваньне да рэвалюцыйных выступленьняў, бо банкноты ангельскага банку, знойдзеныя ў асоб, арыштаваных за вялікдзень за незаконнае ўладаньне зброю, як выявілася, паходзяць з расейскае банкаўскае арганізацыі, якая вядзе справы ў Англіі.

Хікс адказаў, што інфармацыя гэтая правільная, і што расьсьледаваньне вядзецца.

Камуністычны дэпутат Саклатвала запытаў, ці ня можа міністр пэўна сказаць, што гэтыя банкноты трапілі проста з расейскага банку ў рукі таго, у каго яны былі знойдзены.

Хікс адказаў: „Я толькі адказваў на запытаньне, і не мая справа растлумачваць яго значэньне".

Саклатвала ізноў запытаў, ці можа міністр заверыць, што банкноты ішлі з расейскага банку, ці мо' яны знаходзіліся і ў іншых банках.

Хікс адказаў: „Калі паважаны член палаты можа паведаміць мне, што гэтыя банкноты прайшлі праз іншыя банкі з моманту іх выпуску і да атрыманьня іх злачынцамі, дык я аднясуся з патрэбнаю ўвагаю да яго інфармацыі. Я магу заявіць, што банкноты, знойдзеныя ў асоб, арыштаваных за незаконнае ўладаньне зброю, былі нядаўна выпушчаны ў зварот расейскімі банкамі".

На запытаньне другога члена палаты Хікс заявіў, што арыштаваныя, аб якіх ідзе гутарка, зьяўляюцца ірляндцамі.

Дэпутат рабочае партыі Кенворты запытаў: «Ці не бярэ пад увагу міністр суп'ёнасьць тае заявы, якую ён зараз зрабіў, бо яна закранае магчымыя дачыненьні між Англіяй і СССРу будучым, і ці ўпэўнен ён, што крыніцы гэтых вестак больш праўдзівыя, чымся тыя, адкуль зьяўляўся «ліст Зіноўева?»

Хікс адказаў: «У часе зьяўленьня «ліста Зіноўева» я ня быў членам ураду. Я адказваю толькі за сваю ўстанову і дакладна пераканаўся ў тым, што весткі гэтыя зьяўляюцца праўдзівымі".

УСТУПКІ КІТАЙСКАЙ БУРЖУАЗЕІ АД ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ.

ВАШЫНГТОН, 19-4. Консул Злучаных Штатаў у Шанхаі паведамляе, што кітайскія выплатчыкі падаткаў шанхайскага міжнароднага сэнтльмэнту згадзіліся на прапанову чужаземцаў увесьці у муніцыпальную раду 3-х членаў-кітайцаў, а ў розныя камісіі муніцыпальнае рады—6 кітайцаў. Асацыяцыя кітайскіх выплатчыкаў падаткаў ужо абрала кітайскіх дарадчыкаў муніцыпалітэту, якія распачынаюць выконваць свае абавязкі, карыстаючыся аднолькавымі правамі і абавязкамі з чужаземнымі дарадчыкамі. Далей, асацыяцыя кітайскіх выплатчыкаў падаткаў абрала 6 прадстаўнікоў для ўдзелу ў працы розных камісій муніцыпальнае рады. Абранымі зь зьяўляцца прадстаўнікі банкірскага сьвету, параходных таварыстваў і прафэсуры.

Сход чужаземных выплатчыкаў падаткаў шанхайскага міжнароднага сэнтльмэнту сёньня пастанавіў дазволіць кітайцам уваход у грамадзкія парки сэнтльмэнту на аднолькавых правах з чужаземцамі.

КЛІЧ ПРАЗ ГРАНІЦЫ ПРОЦІ ТЫРАНІІ Ў БЭСАРАБІІ.

Усесаюзны зьезд бэсарабскіх эмігрантаў.

ХАРКАЎ, 19-4. Урачыста адчынен другі ўсесаюзны зьезд бэсарабскіх эмігрантаў. На зьезьдзе ўдзельнічаюць філіі таварыства--туркестанская, крымская, каўкаская, ленінградзкая, маскоўская, і інш. Зьезд атрымаў шмат прывітаньняў, у тым ліку зд парыскага, льежскага, прагскага і венскага таварыстваў бэсарабцаў, ад чэха-славацкае лігі барацьбы з тэрорам і інш.

Ад пісьменьніка Істраты атрымана тэлеграма наступнага зьместу: „Ня маючы магчымасьці прыехаць на зьезд, я сэрцам і душою з прадстаўнікамі бэсарабскага народу, які сабраўся на зьезд у Харкаве. Завяраю зьезд у маёй адданасьці і маім удзеле ў барацьбе проці лютае тыраніі румынскіх баяр".

Адчыняючы зьезд, старшыня Цэнтральнага Савету Т-ва Бэсарабцаў тав. Левінзон прысьвяціў некалькі чулых слоў ахвярам румынскага тэрору ў Бэсарабіі, памяць якіх зьезд ушанаваў уставаньнем і выказаў упэўненасьць, што барпліваасьць працоўных Бэсарабіі можа скончыцца хутчэй, чымся гэтага можна чакаць, і тады прыдзе канец панаваньню румынскай алігархіі.

Таварыства бэсарабцаў—кажа далей Левінзон—зьяўляецца вялікім атрадам шматмілійнае арміі рабочых і сялян, якія змагаюцца з нацыянальным уціскам і панаваньнем імпэрыялізму ва ўсім сьвеце. У задачы нашага таварыства ўваходзяць мабілізацыя грамадзкае думкі СССР вакол бэсарабскага пытаньня.

Заслухаўшы прывітаньні, зьезд пастанавіў тэлеграфна выказаць саюзнаму ўраду, усеукраінскаму ЦВК і ўрадам саюзных рэспублік ад імя бэсарабскіх эмігрантаў падзяку за аказаную ім у СССР гасьціннасьць і боатэрскія адносіны.

УСЕАГУЛЬНЫ ЛЁКАЎТ САКСОНСКІХ МЭТАЛЁЎЦАЎ.

БЕРЛІН, 19-IV. Лёкаут у саксонскай мэталёвай прамысловасьці распаўсюджаны на ўсіх без выключэньня саксонскіх мэталёўцаў, якіх налічваецца **250 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК.**

Другі земляздрыг у Баўгарыі.

ВЕНА, 19-4. Як паведамляюць з Сафіі, учора ўвечары ў Баўгарыі адбыўся новы земляздрыг, мацнейшы за першы. Цэнтр земляздрыгу недалёка ад Філіпопалю, які моцна пашкоджаны. Невялікія падзёмныя штуршкі адчуваліся таксама ў Белградзе і ў Бухарэсьце.

Працэс Беларускай Грамады.

Скончыўся допыт сьведак.

СПРЭЧКІ БАКОЎ БУДУЦЬ ПРАХОДЗІЦЬ П. Ы ЗАЧЫНЕНЫХ ДЗЬВЯРОХ.

(Ад нашага варшаўскага карэспандэнта).

Сёньня скончыўся допыт сьведак, хоць чакаецца, што да сканчэньня судовага дазнаньня будзе выслухана яшчэ некалькі сьведак, якія спазьніліся.

Суд распачаў чытаць дакументы і матар'ялы. Яшчэ да спрэчак адбудзецца паказаньне экспэртызы; будзе выказана думка экспэртызы наконт беларускага банку.

Сьведкі абарокы выявілі і падкрэсьлілі ролю і палітычную сутнасьць працэсу. Паказаньні Тугута, Хамінскага, Касмоўскай, Уласава, Станкевіча і Валынца выкрылі характар працэсу, які зьяўляецца гістарычным судом над вызваленчым беларускім рухам.

З ліку апошніх сьведак трэба зазначыць сьведку СЬВЯНЕВІЧА, супрацоўніка «Кур'ера Віленскага», які лічыцца знаўцаю беларускага пытаньня. Сьвяневіч заяўляе: «Тарашкевіч верыў, што ўдасца дамагчыся хоць мінімальнага здаволеньня беларускіх дамаганьняў праз перамовы з урадам. Урад і польская грамада не жадалі пайсьці на самыя малыя ўступкі. Тарашкевіч, пераканаўшыся, што яго надзеі не ажыцьцёвяцца, убачыў, што да гэтае мэты трэба імкнуцца іншымі сродкамі. Гэта быў галоўны пункт арганізацыі Грамады». Сьведка адзначае, што тэндэнцыі да стварэньня масавае нацыянальна-беларускае арганізацыі знашлі сваё выяўленьне ў Грамадзе.

Дэпутат сойму ГАЎРЫЛІК, ранейшы настаўнік беларускае гімназіі ў Слуцку, катэгарычна адхіляе, што скончыўшым гімназію вучням выдаваліся прапускі на праезд у СССР. Атрымаўшыя пасьведчаньне аб сярэдняй адукацыі вучні прымушаны былі выяжджаць у Менск і іншыя унівэрсытэты, бо ў польскія унівэрсытэты іх ня прымалі.

Ёсьць чуткі, зьмешчаныя, між іншым, у аднэй з газэт, што старшыня суду намеран зачыніць дзьверы ў часе спрэчак бакоў.

* * *

Вільня. З допыту сьведак на судзе Грамады выявілася, што абвінавачаны ў забойстве агента паліцыі Івашкевіча Кавалёў—сам быў ахраньнікам.

Сьведка Хамінскі, ранейшы дэпутат «Вызваленьня», паказаў, што дэмакратыя Віленшчыны вельмі прыхільна адносілася да Тарашкевіча. На запытаньне пракурора, ці імкнуўся Тарашкевіч да незалежнасьці Беларусі, сьведка заявіў, што да гэтага імкнецца кожны сумленны беларус.

Ранейшы беларускі сэнатар Уласаў зазначыў, што ня лічыўся ў складзе Грамады, але адабрае палітыку Грамады, якая імкнулася дасягнуць сваіх ідэалаў праз арганізацыю беларускіх мас.

Апошнія два дні на працэсе прысутнічаў спэцыяльны карэспандэнт газэты «Пары Суар».

Паказаньні сьведак абароны на працэсе.

«Кур'ер Віленскі» дае досыць падрабязную інфармацыю аб 33 дні працэсу «Грамады», калі выступілі сьведкі з боку абароны.

Дзеля таго, што гэтыя сьведкі малююць падсудных на аснове сваіх шматгадовых знаёмстваў з абвінавачанымі і іх працай, а таксама сваіх уражаньняў аб гэтай працы, мы прыводзім тут інфармацыі ва «Кур. Віл».

У гэты дзень давалі паказаньні наступныя сьведкі: пасол сойму **КАСМОЎСКАЯ**, былы міністр **ТУГУТ**, прафэсар **ЮНДЗІЛ** і пасол сойму **ВЫГОДЗКІ**.

Першай дае паказаньні *Касмоўская*. На запытаньне адваката Бабянскага, ад якога часу яна ведае Тарашкевіча, Касмоўская адказвае: «Тарашкевіча я ведаю з 1916 году ў Петэрбурзе. Выхоўваў ён тады ў польскім доме дзяцей інжэнэра Зябіцкага. Сьведка спаткалася там з Тарашкевічам. Далей Касмоўская сьведчыць, што беларускім рухам яна цікавілася з даўняга часу, яшчэ ў часе выданьня «Нашае Нівы»; пазнаёмілася з ім, будучы на вакацыях у паноў Гардзялкоўскіх у Меншчыне, дзе ў той час пражывалі браты Луцкевічы. Гардзялкоўскія і шэраг іншых польскіх абшарнікаў адносіліся ў тыя часы прыхільна да беларускага адраджэньня: маральна і фінансамі падтрымлівалі беларускі культурны і нацыянальны рух. Потым з Тарашкевічам яна сустрэлася ў сойме ў 1922 г. Першае выступленьне Тарашкевіча ў сойме пасьля экспазэ прэм'ера генэрала Сікорскага сьведчыла аб яго лёяльных адносінах да польскае дзяржаўнасьці, аб шчырым імкненьні да супрацоўніцтва дэмакратыяў абодвых народаў. У яго прамове можна было заўважыць жаданьне ажыцьцёвіць тыя абяцанкі, якія заключаліся ў „Віленскай адозве" вярхоўнага правадыра, як роўным чынам абяцанкі папярэдніх урадаў. З часам культурна-нацыянальныя патрэбы беларускага народу ня былі ажыцьцёўлены, выступленьні Тарашкевіча ў сойме мелі характар больш апазіцыйны.

Адвакат Сьмяроўскі: «Якія былі адносіны польскае правіцы, г. зн. эндэкаў, хадэкаў і пясту да беларусоў?»

Касмоўская: «Вязумоўна, з прыкрасьцю гэта сьцьвярджаю, што яны былі вельмі варожыя. Тарашкевіч, між іншым, у аднэй з сваіх прамоў выказаў сваё зьдзіўленьне, бачачы, што пасол Карфанты, прадстаўнік тае часткі Польшчы, якая найбольш была ў прыгнечаньні ад немцаў, пяпер выступае так варожа ў адносінах да іншых народаў».

Адвакат Сьмяроўскі: «Ці вы сабе не прыпамінаеце, як пасол Дамброўскі ў 1923 г. кінуў па адрасе Тарашкевіча словы: «Што вы падпісвалі два тыдні таму назад?»

Касмоўская: Прыпамінаю, што гэтыя словы выклікалі вялікае абурэньне на лавах соймавае лявіцы.

Судзьдзя Бжазоўскі: «Як вы лічыце Тарашкевіча—патрыётам, ці кар'ерыстам?»

Касмоўская: «Заўсёды лічыла і лічу яго беларускім патрыётам, які імкнецца паправіць долю свайго народу».

Судзьдзя Барэйка: «Ці расчараваньне, аб якім сьведка гаворыць, ня было выклікана зьменаю палітычнае арыентацыі»?

Касмоўская: «Тарашкевіч ліччыў сябе беларусам, выхаваным у польскай культуры, ведаю яго, як аднаго з найлепшых знаўцаў Міцкевіча».

Пасьля дае паказаньні былы віцэ-старшыня ўраду *Станіслаў Тугут*. Ён паўтарае паказаньні Касмоўскае, дадаючы да іх некаторыя падрабязнасьці на карысьць Тарашкевіча і абвінавачвае ва ўсіх далейшых выпадках з Грамадою польскія ўрады, якія ня выконвалі сваіх неаднаразовых абяцанак у адносінах да беларускага адраджэнчага руху. Тугут спыняецца потым на асобе Антона Луцкевіча.

Адвакат Пятрусэвіч: «Ці вы ведаеце Антона Луцкевіча»?

Тугут: „Антона Луцкевіча ведаю з 1922 г. Потым спатыкаўся з ім у 1927 г., калі прыяжджаў у Вільню па справе ўтварэньня ў Вільні аддзелу Інстытуту для абсьледаваньня нацыянальных спраў. Тады я быў у Луцкевіча. На сходзе, скліканым па гэтай справе, ня гледзячы на вострае выступленьне пасла Яраміча па справе зьмены курсу польскае палітыкі да беларусаў, які ад гэтага ўзалежніў свой удзел у працы Інстытуту, Луцкевіч сваё супрацоўніцтва абяцаў».

Адвакат Пятрусэвіч: «Значыць, Антон Луцкевіч не адмаўляўся ад супрацоўніцтва з палякамі?»

Тугут: «Не. У пачатку Беларускі Клюб ішоў з польскай дэмакратыяй. Беларускі Клюб падтрымоўваў урад Сікорскага, пазьней, аднак, дзякуючы не ажыцьцёўленьню ніводнага з дамаганьняў беларусаў, адносна якіх урад не шкадаваў абяцанак, радыкальны напрамак пераважыў».

Пасьля Тугута дае паказаньні *праф. Юндзіл*, які добра ведае братоў Луцкевічаў і характарызуе іх, як культурна-нацыянальных дзеячоў, якія пры розных умовах працавалі для культурна-нацыянальнага адраджэньня Беларусі. Жылі вельмі небагата.

Наступны сьведка *пасол Выгоцкі* кажа, што ён ведае братоў Луцкевічаў 20 гадоў. Луцкевічы былі людзьмі без спэцыяльна-палітычных перакананьняў. Былі яны нацыяналістамі ў поўным і шляхетным гэтага слова значэньні. Беларуская школа, мова, лемантар,—вось заданьні, якімі захапляліся Луцкевічы. Былі яны бедныя людзі, часта на мелі чым плаціць за абед. Псыхалёгія гэтых людзей і маральная ідэя іх не даюць магчымасьці абвінавачваць іх у кар'ерызьме.

Трэцяя сэсія ЦВК СССР.

Новы закон аб землякарыстаньні і земляўпарадкаваньні.

Даклад т. Мілюціна.

МАСКВА, 19-IV. На вячэрнім пасяджэньні сэсіі ЦВК СССР 19 красавіка з дакладам аб законапраэкце агульных пачаткаў землякарыстаньня і земляўпарадкаваньня выступіў Мілюцін. Дакладчык зазначыў, што гэты закон закранае самыя асноўныя патрэбы нашае вёскі, бо на зямельных адносінах асноўваюцца эканамічныя і палітычныя адносіны сялянства.

Новы законапраэкт быў распрацаваны па ініцыятыве саміх саюзных рэспублік, прычым у аснову яго пакладзены пастановы 4-га зьезду саветаў, а таксама пажаданьні шэрагу нарад сялян і спэцыялістаў-земляўпарадкавацеляў. Закон дае ня толькі агульныя дырэктывы, але і канкрэтныя адказы на пытаньні зямельнае палітыкі. Сучасны пэрыяд высоўвае перад намі задачу перабудаваць сельскую гаспадарку на высокай тэхнічнай аснове. У межах гэтае задачы і ставяцца зараз пытаньні землякарыстаньня і земляўпарадкаваньня. Асноўная лінія землякарыстаньня і земляўпарадкаваньня накіравана на рост ураджайнасьці сельскае гаспадаркі, а гэта ў сваю чаргу дасьць нашай прамысловасьці магчымасьць павялічыць выраб сродкаў вытворчасьці і забясьпечыць вёску сельска-гаспадарчымі прыладамі.

Мілюцін характарызуе далей асобныя артыкулы праэкту закону. **У першым разьдзеле** праэкту закону—гаворыць Мілюцін—дакляруецца нацыяналізацыя зямлі і дакладна вызначаюцца прэрагатывы Саюзу ССР і саюзных рэспублік у справе загадваньня зямлёю, а таксама ў адносінах зямельнага законадаўніцтва. **У другім разьдзеле** ўстанаўляюцца правы працоўных на зямлю, прычым тут агаворана, што пераважнае права атрымліваць зямлю ў працоўнае землякарыстаньне маюць сельска-гаспадарчыя калектывы, а таксама бяднейшае малазямельнае і безьзямельнае жыхарства. У законе значнае месца займаюць палёгкі сельска-гаспадарчым калектывам і незаможным гушчам сялянскага жыхарства. Так, напр., у разьдзеле аб земляўпарадкаваньні зазначана, што **для арганізацыі зямельнае плошчы калектыўных гаспадарак земляўпарадкаваньне праводзіцца ў першую чаргу, а незаможным сялянскім гаспадаркам даецца перавага перад іншымі землякарыстацелямі на больш выгодна разьмеркаваныя землі. Земляўпарадкаваньне ўсіх бядняцкіх, незаможных серадняцкіх і ўсіх калектыўных гаспадарак праводзіцца за кошт дзяржавы.**

У праэкце закону прадугледжаны ў асобным разьдзеле меры падахвочваньня да калектыўных і іншых таварыскіх форм землякарыстаньня, а таксама прадугледжана заснаваць правільныя ўзаемадачыненьні між зямельнымі таварыствамі і сельсаветамі. У адзнаку ад існуючае да сучаснага моманту практыкі, членамі зямельнага таварыства будуць лічыцца ўсе асобы, якія ўваходзяць у склад двароў, а таксама асобы, якія і не ўваходзяць у склад двароў, але якія ўдзельнічаюць сваёю працаю ў сельскай гаспадарцы данага таварыства, ці ў яго абслугоўваньні, калі яны пражываюць на тэрыторыі таварыства ня менш году. Такім чынам парабкі, пастухі і кавалі набываюць права голасу ў зямельных таварыствах. На сельсаветы ўскладаецца кіраўніцтва працаю зямельных таварыстваў.

У новым законе зьвернута ўвага на барацьбу з прыватнымі перадзеламі.

Што дае сёлета савецкая ўлада беднаце.

З дакладу т. Калініна аб адзіным с.-г. падатку.

З кожным годам рост сельска-гаспадарчага падатку, як аднаго з фактараў, вызначаючых адносіны між работаю клясаю і сялянствам, патроху зьніжаецца, бо сельска-гаспадарчы падатак прынамсі за апошніх 6 гадоў па сваіх разьмерах застаецца амаль у стабільным стане, між тым, як бюджэт наш у той самы час узрос з 2-х да 6-ці міліярдаў рублёў. Згодна новага закону, павялічэньне сельска-гаспадарчага падатку да 100 міліёнаў рублёў адразу нібы здаецца і значным, але ў параўнаньні з 1924-25 г. гэтае павялічэньне складае толькі 54 міліёны рублёў. **Між тым, бюджэт наш узрос за гэты час у тры разы.**

Поруч з ростам бюджэту ўзрасла значна прадукцыйнасьць сялянскае гаспадаркі, яе гадавая прыбытковасьць. У 1924 25 г. **прыбытковасьць сялянства** складала 3.264 міліёны рублёў, а ў **1927-28 г. ужо 5.177 міліёнаў.** На падставе ўсяго гэтага мы можам сказаць, што новы праэкт пастановы аб с.-г. падатку не пагражае павялічэньнем пяжкасьці абкладаньня для галоўнай масы сялянства, бо, зьяўляючыся прагрэсыўна прыбытковым, закранае пераважна заможную групу выплатчыкаў. Згодна пададзенага на вашае абмеркваньне праэкту закону аб с.—г. падатку, падлягае поўнаму вызваленьню ад падатку 35 проц. сялянскіх гаспадарак пры адначасным росьце ападаткаваньня, заможнага сялянства.

Да гэтага часу мы мелі, па сутнасьці кажучы, такое стачовішча, калі падатак асноўным сваім пяжарам ускладаўся на збожжавую гаспадарку. У пададзеным на зацьверджаньне сэсіі праэкце закону ў гэтай частцы зроблена значная зьмена, сэнс якое ў тым, што пяжкасьць падаткаў на не земляробчыя заработкі павялічваецца, а на ральніцтва зьніжаецца.

Мы выдаём сёлета на сельскую гаспадарку 714 міліёнаў рублёў, г. зн. на 300 з лішкам міліёнаў рублёў больш, чымся ўвесь селаска-гаспадарчы падатак. Калі сельска-гаспадарчым падаткам мы паслаблям сялянскую верхавіну, дык **выдачаю 714-ці міліёнаў рублёў мы падтрымліваем беднату і разьвіваем калектыўную гаспадарку.** У гэтых адносінах мы зьяўляемся поўна процілегласьцю капіталістычнаму сьвету, які ўсюды раўнае сялян з навольнікамі.

Тав. Рыкаў аб нашым бюджэце.

З прамовы на ранішнім пасядж. 16-IV.

Пры разглядзе праэкту бюджэту ў СНК—кажа тав. Рыкаў—мы знаходзіліся пад уплывам перашкод у хлебазагатоўках і мы вельмі непакоіліся, ці здолеем забясьпечыць запраэктаваны нават у меншым абхваце прыбытковы бюджэт. І толькі тым, што ў нас засталося надзвычайна мала часу (са студзеня да канца зімняе дарогі), у які мы павінны былі забясьпечыць край хлебам на ўвесь пэрыяд да новага ўраджаю, толькі гэтым тлумачыцца той ударны характар хлебазагатоўчае кампаніі, які яна мела са студзеня сёлетняга году.

Дазвольце зараз—сказаў потым Рыкаў,—выказаць некалькі думак па сутнасьці бюджэту. Тут ужо зазначалася на запозьненае яго складаньне і зацьверджаньне. Чым тлумачыцца гэтая запозьненасьць? Цяжкасьць складаньня нашага бюджэту ў тым, што ён па сутнасьці зьяўляецца галоўнаю часткаю гаспадарчага пляну і павінен разглядацца разам з ім. Пазбавіцца ў далейшым запозьненасьці можна будзе, калі спрасьцім самую сыстэму плянаваньня.

ДРУГОЕ БУЙНАЕ ПЫТАНЬНЕ, якое было тут узьнята, гэта параўнаньне купляное сілы нашае валюты з заграніччымі. Ня бодчыся абвінавачаньня ў буржуазным ухіле, я павінен прызнаць, што суадносіны набывальных сіл нашае і заграніччых валют зараз горшыя, чымся былі ў 1913 годзе. Мы перажылі выключнае зруйнаваньне нашае гаспадаркі, значна большае зруйнаваньне, чымся кожны буржуазны край, і толькі за апошнія гады ў нас пачынае адбывацца пералом у бок выраўніваньня нашае валюты з заграніччымі.

ТРЭЦЯЕ ПЫТАНЬНЕ — наконт прыватніка. Два апошнія гады праходзілі пад знакам інтэнсыўнагавыцісканьня прыватніка. Урад Саюзу выдаў шмат законаў, якія ўмацняюць ападаткаваньне буржуазеі, абмяжоўваючы яе рост, і палягчаюць становішча працоўных, становішча гарадзкое і вясковае беднаты. Асаблівасьцю ўсёй нашай фінансавай палітыкі і бюджэту, які вам пададзен на разгляд, зьяўляецца тое, што калі ў кожным бу жуазным краі адбываецца пераразьмеркаваньне нацыянальнага прыбытку ў бок павялічэньня прыбыткаў для багацеяў і ўласьніцкіх гушчаў за кошт працоўных, дык **мы праводзім і будзем праводзіць пераразьмеркаваньне нацыянальнага прыбытку ў бок забесьпячэньня інтарэсаў рабочае клясы і асноўнае масы сялянства.**

НЯМЕЦКІЯ ПРАВІНЦЫІ НЯ ЗГОДНЫ НА РОСПУСК ЧЫРВОНАГА САЮЗУ ФРАНТАВІКОЎ.

Муніцыпалітэт Бэрліну дамагаецца адмены загаду.

БЭРЛІН, 19 IV. Учора былі ўхвалены вострыя рэзалюцыі пратэсту проці роспуску чырвонага саюзу франтавікоў на шматякіх рабочых сходах. На ўчарайшым пасяджэньні муніцыпалітэту ў Кепэніку (ваколіца Бэрліну) ухвалена прапанова камфракцыі зьвярнуцца да бэрлінскае гарадзкое ўправы з прапановаю ўжыць неабходныя захады, каб дамагчыся адмены патрабаваньня міністра ўнутраных спраў Кейдэля аб роспуску чырвонага саюзу франтавікоў. Водлуг патрабаваньня камуністычных дэпутатаў распушчанага рэйхстагу, на аўторак склікана пасяджэньне наглядальнага камітэту рэйхстагу, паўнамоцтвы якога захоўваюцца ў моцы ў часе між роспускам старога і склікам новага рэйхстагу;

ФРАНТАВІКІ ЗАСТАНУЦЦА НА ВАРЦЕ РЭВАЛЮЦЫІ.

Адозва ЦК саюзу чырвоных франтавікоў.

БЭРЛІН, 19-4. Цэнтральны камітэт чырвонага саюзу франтавікоў і існуючыя пры саюзе арганізацыі моладзі агаласілі адозву наконт патрабаваньня міністра ўнутраных спраў Кейдэля расьпусьціць чырвоны саюз франтавікоў.

Адозва падкрэсьлівае, што прускія сацыял-дэмакратычныя міністры ўнутраных спраў—у пачатку Зэвэрынг, а потым Кржэзінскі—расчысьцілі дарогу для Кейдэля, бо яны распусьцілі мясцовыя арганізацыі саюзу ў Тортмундзе, Гіндэнбурзе і Фалькенбурзе.

«Цяпер сацыял-дэмакратычныя міністры асобных нямецкіх дзяржаў,—гаворыцца у адозве,—апэлююць да вярхоўнага дзяржаўнага суду, які за нікчэмныя правіннасьці засудзіў на катаргу тысячы рэвалюцыйных рабочых. Роспуск чырвонага саюзу франтавікоў—гэта адказ буржуазеі на гатоўнасьць мілёнаў нямецкіх рабочых змагацца проці імпэрыялістычнае вайны і на абарону СССР. Чырвоны саюз франтавікоў не пакіне сваёй баявой варты на чале нямецкіх рабочых мас. Ніякі роспуск не перашкодзіць яму таксама і ў далейшым быць жалезным мурам, які ахоўвае працоўных ад тэрарыстычнага панаваньня ўраду трэстаўскага капіталу».

Проці роспуску.

БЭРЛІН, 19-IV. Урады Саксоніі і Ангальта выказаліся проці прапановы нямецкага міністра ўнутраных спраў Кейдэля распусьціць чырвоны саюз франтавікоў.

БЭРЛІН, 19-4. Урад Бадэну заявіў вярхоўнаму дзяржаўнаму суду пратэст проці патрабаваньня міністра ўнутраных спраў Кейдэля распусьціць чырвоны саюз франтавікоў.

МОЦНЫЯ НЭРВЫ.

Мінаюць дні, тыдні, месяц...

Штодня з-пад цёмных столяў турмы, па сырых лукішскіх падвалах прыводзяць натоўпы грамадаўцаў на суд.

Штодня па казённых білетах, атрымліваючы «прагонныя», зьяжджаюцца ў Вільню сотні сьведак пракуратуры,—сьведак таго рэжыму, які сёньня пануе на абшарах Заходняй Беларусі.

Штодня па адрасу гэраічнай народнай Грамады ільлюцца струменьні ілжывых даносаў, дэфэнзыўных выдумак, брудных маны, нізьлічоная колькасьць падложных сьведчаньняў, дакумантаў, паказаньняў.

Фашысцкі павук услаўленай Польскай дзяржавы тчэ сваё агіднае павуціньне.

Шмат хто змарыўся ў гэтым працэсе.

Змарыліся карэспанденты замежных газэтаў, ня ў сілах будучы сачыць за зваротамі дэфэнзыўнага павучыньня рабіць справаздачы сваім чытачом.

Змарыліся чытачы, штодня з раніцы натыкаючыся на трафарэтную фразу: «судовае сьледзтва цягнецца сваім парадкам далей».

Змарылася самая прэса,—тая сіла, што няўміручa жыве ўсялякага гатунку сэнсацыямі, навінамі і якая надае гэтым навінам свой зьмест і свае адценьні.

Ступіліся пер'і,—ступіліся нэрвы.

Адно дзьве стараны не змарыліся ў гэтым чудовішным працэсе,—

польскі суд

і Беларуская Грамада.

Кожная з гэтых старон занадта добра разумее трагізм становішча, занадта добра ўсьведамляе гістарычнае значэньне працэсу, каб быць зморанай, як зморанасьцю паслабіць свае нэрвы.

Дапраўды,—у гэтым працэсе Грамады лішні раз пацьвярджаецца ісьціна рымлян, пераказаная ў апошнюю імпэрыялістычную вайну: той выйграе у сьмяртэльным змаганьні, у каго нэрвы мацнейшыя.

Што як не вайна, не сьмяртэльнае змаганьне адбываецца ўжо другі мэсяц у мурох віленскага суду? Чым, як не змагарным спаборніцтвам, можна назваць трыццацідзённае стаяньне Грамады прад арсэналам польскага фашысцкага суду.

Мы, прынамсі, ласьне так і глядзім на спрэчу.

Мужыцкая, пакутная Беларусь сотні год чакала сваёй сустрэчы з панскай Польшчай. Курная хата і блескучы палац, прыбітая вёска і багаты панскі двор сотні год стаялі адзін супроць другога на неабмежаным прасторы ад Буга да Дняпра, паглядаючы—адзін з вышыні і з пагардай, другая—з нізіны, са сьціснутымі зубамі, са злабой.

Сотні год трывала маўклівая, тоячая варожасьць паміж польскім панскім маёнткам на Беларусі і народнымі масамі. Глыбокая процьма сацыяльнай і нацыянальнай процілежнасьці ляжала паміж імі.

Ня раз імкнуліся сэнтыментальныя душы, рамантыкі слова засыпаць гэтую процьму. Лелевель, Чачот, Рыпінскі, Кіркор, Ельскі,—ды мала іх было!—стараліся перакінуць залаты мосток паразуменьня паміж беларускім прыгонным мужыком і разьбіўшымся польскім панам. Колькі прыгожых слоў было сказана! Якія сымпатычныя тэорыі былі прадложаны, каб прымірыць непрымірымае.

Беларусь—гэта gente albo-ruthenus, natione polonus.

Беларусы,—гэта не агідныя «масалі», гэта «просты народ--славяне, крывічы, родныя ляхам, якія любяць сваю айчыну--Польшчу за ўсё».

Ня менш малюнкова і з нямецкім захапленьнем пісалі і гаварылі аб Польшчы, аб яе дэмакратычнасьці, яе супольнасьці з беларусамі, пазьнейшыя эпігоны тэй жа тэорыі. Мы добра памятуем постаці паноў Іваноўскіх, Дубяйкоўскіх et tutti quanti.

Дзе яны? Чаму, як мышы з тонучага караблю, першымі зьбеглі яны са сцэны, калі трыумфуючы польскі фашызм запанаваў на заходня-беларускіх землях? Іх мара споўнілася! Іх ідэал зьдзейсьніўся!

Так, ідэал зьдзейсьніўся... І ўсе яны, як непатрэбны хлам, зваліліся ў тую яму-процьму, якую хацелі засыпаць.

І зноў, як сто гадоў назад, стаяць адна супроць аднэй панская Польшча і сялянская Беларусь.

«Калі-ж скончыцца гэтая камэдыя?»—спытаў на адным з апошніх паседжаньняў павадыр Грамады, Браніслаў Тарашкевіч.

Гэтая «камэдыя» скончылася ў той момант, калі грамадзяны былі прыведзены пад саблямі жандараў у залю судовага паседжаньня. Яна скончылася нават раней,—у тыя дні, калі ў Старым Бярозаве ўпяршыню польскі «вызвалены жандар» апэцкаў свае рукі ў крыві беларускіх дэпутатаў.

А можа яна скончылася яшчэ раней, калі генэрал Шэптыцкі пад час «вызвольнага паходу на Беларусь Пілсудзкага пускаў з дымам беларускія вёскі і сёк да сьмерці старыкоў і жанчын.

Старая, старэтная гэта рэч,—польска-беларуская, «панска-мужыцкая камэдыя». Быць можа толькі мы, інтэлігенты, тэарэтыкі, абстрактныя дасьледчыкі не заўважалі яе раней.

Цяпер і сьляпым ясна і відна.

Дзьве стараны,—два шляхі.

Дзьве сілы,—і нязломнае змаганьне.

Трыццаць дзён цягнецца ўжо судовы працэс. Трыццаць дзён тэ фашысцкі павук свае павуціньне, цягне нэрвы з блядых падсудных.

Суд ведае, што робіць: ён бачыць, што юрыдычна, на аснове параграфаў крымінальнага кодэксу, ён праіграў, што безьліч фальшывых сьведак толькі пагоршылі праўны бок працэсу.

Застаецца другая палова справы,—выйграць працэс «маральна». Вось аб гэтым б'ецца цяпер мысьль суду, вось гэтым заклапочаны сёньня Бэльвэдэр і яго верныя слугі ў Вільні. Ім ходзіць аб тое, каб *маральна* зламаць Грамаду, каб прымусіць яе зайвіць сваю слабасьць, папрасіць літасьці, палёгкі. Для гэтага—безьліч сьведак, месячная працэдура, бясконцы допыт.

Дарэмныя надзеі!

Нязломаныя за год мучэньняў у адзіночках Вронак, Пазнані і Лукішак,—грамадаўцы застаюцца нязломнымі і ў нячуваным працэсе. Нікай трывае працэс яшчэ месяц,—мы пэўны за Тарашкевіча, Міхайлоўскага, Луцкевіча і таварышоў.

Чаму?

А таму, што мужыцкія нэрвы былі і застануцца мацнейшымі за панскія. Ня месяц і ня год, а стагодзьдзі былі яны ў допыце,—і вытрымалі. Дык няўжо-ж паважна думаюць паны судзьдзі сарваць іх монстр-працэсам?

Ёсьць уражаньне, што стараецца адваротнае. Тыя весткі аб інцыдэнце, якія прынесьлі газэты ў зьвязку з окрыкам Тарашкевіча, сьведчаць, што *польскі суд страціўся*. Ня гледзячы на актыўныя заявы пракурора, у якім сканцэнтраваны імпульс усёй фашысцкай зграі,—судзьдзі не маглі вытрымаць стварыўшайся атмасфэры і спынілі паседжаньне. Яны, а не падсудныя зламаліся. Яны, судзьдзі, што сядзяць за сталом у залатых пазумэнтах і пад абаронай паліцыі, выйшлі са стварыўшагася інцыдэнта пабітымі, падупаўшымі.

Хто ведае псыхалёгію судовага працэсу, таму зразумела, што гэта знача. У гісторыі буржуазнага суда ня раз здараліся выпадкі, калі маральна разьбітых судзьдзяў замянялі новым складам, прызначалі новы працэс, абы толькі выйсьці са справы з чэсьцю.

Віленскі суд мусіць схамянуцца,—мусіць аправіцца. Да гэтага яго прымушае гонар фашысцкай дзяржавы, уласны панскі гонар. Але выйсьці са справы з чэсьцю яму ня дана.

Ня гледзячы на няжэйшы прысуд дэ-юрэ,—на справе Грамада выйдзе з працэсу яшчэ больш моцнай, яшчэ больш непераможнай.

Лішні месяц гульні на нэрвах толькі больш разьдзьмухае ореол яе нязломнасьці, яе гэраізму.

АЛЯКСАНДР ЦЬВІКЕВІЧ.

Перад вясеньняй сяўбой.

Не хапае штучнага ўгнаеньня.

У нашым раёне працуе 18 машын па ачыстцы насеньня. Дагэтуль ачышчана: больш 4000 пуд. аўса, што складае 60 проц. заявак; адсартавана канюшыны 350 пуд., ці 100 проц. заданьня; вікі 830 пуд.—75 проц.; лубіну 250 пуд.—каля 30 проц.; лёну—450 пуд., ці 45 проц.; цімафееўкі—58 пуд.--заданьне выканана поўнасьцю і ячменю—520 пуд., ці 38 пр. плянавага заданьня.

Досыць маецца насеньня кораньплодаў, але затое адчуваецца вялікі недахват у штучным угнаеньні, якога ў раёне ёсьць толькі 840 пуд., а патрэбна звыш 2000 пуд. В—ў.

Чычэрына, Гомельшчына.

Ці патрэбны такія калектывы?

Дзеля чаго мы арганізоўваем сялян у калектывы? Дзеля чаго дзяржава затрачвае сродкі на калектывізацыю сялян? Гэтым дзяржава хоча найхутчэй пазбавіць сялян ад іх штодзённых недастаткаў. Мы праз калектывы хочам вызваліцца ад нашай беднасьці. Ужо арганізаваныя калектывы павінны паказаць прыклад селяніну, які жыве яшчэ па-прадзедаўску.

Дык вось, паглядзеце, які прыклад дае насельніцтву калектыў «Араты» (Пясоцкі сельсавет, Капыльскі раён).

Калектыў „Араты" арганізаваўся 6 гадоў таму назад. У калектыў увайшлі 3 серадняцкія гаспадаркі з м-ка Пясочнага. Як бачым, „Араты" праіснаваў ня мала—шэсьць гадоў. А што ён да гэтага часу прыкладнае зрабіў? Анічагуткі. За гэтыя шэсьць гадоў не пасеяў ні каліва культурных траў. Гаспадарка вядзецца пастарому. Маемасьць калектыву ня лічыцца агульнаю, а ўласнаю: кожны жыве паасобку, мае ўласную скаціну, сельскагаспадарчыя прылады.

Гэткі „калектыў", вядома, ня толькі ня можа быць прыкладным, а нават мець назву калектыву. Ён толькі адахвочвае сялян ад калектывізацыі.

На мой погляд, каб „Араты" не рабіў падрыву ў калектывізацыі сялянства, зараз-жа патрэбна аздаравіць калектыў,—у калектыве павінны быць людзі, якія сапраўды хочуць працаваць калектыўна.

Дзед Лявон.

Капыльскі раён, Меншчына.

Як праходзіць падрыхтоўка да вясеньняй сяўбы.

ЗАГАТОЎКА ЛУБІНУ ПРАХОДЗІЦЬ СЛАБА.—АВЁС ХОЦЬ І АДГРУЖАН, АЛЕ ШМАТ НАСЕНЬНЯ ІДЗЕ Ў ГЛУМ, БО ТРЭБА ЧЫСЬЦІЦЬ ЯГО—К-ТЫ СЯЛЯНСКАЙ УЗАЕМАДАПАМОГІ СЛАБА РЫХТУЮЦЦА ДА ВЯСЕНЬНЯЙ СЯЎБЫ.—БЕЛСЕЛЬСАЮЗ ПАВІНЕН ПАКЛАПАЦІЦЦА АБ ЗАГАТОЎЦЫ НАСЕНЬНЯ ЛУГАВЫХ ТРАЎ.

Асобая нарада пры Наркамземе па падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы гэтымі днямі заслухала справаздачы загатавіцеляў аб ходзе загатовак с.-г. машын, угнаеньня і рознага насеньня.

Па Белсельсаюзу да 10-га красавіка выканан плян завозу: плугоў на 85 проц., барон—51 проц., арфаў—100 проц., сартовак—157 проц., трыераў—300 проц., трактараў—43,4 проц., канюшыны—140 проц., сэрадэлі—100 проц., вікі—142 проц., лубіну—33 проц., аўсу—87 проц., ячменю—280 проц., прадбачыцца завезьці на 85 проц. рознага мінэральнага ўгнаньня.

У часьці с.-г. машын магчыма будзе недахват у баронах-спрунжыноўках, мае быць завезена ў хуткім часе 75 трыераў.

Па насеньню ня будзе выканан плян на лубін; на німафееўку і карняплоды плян хоць выконваецца на 82 проц., але недахватаў у гэтай галіне ня будзе.

Па лініі Цэнтраземскладу магчыма будзе бракаваць ільнатрашчотак. Што-ж датычыцца да трыераў, дык на гэтым тыдні атрыманы 100 трыераў сыстэмы Гэйда, якія хутка будуць разьмеркаваны па акругах, і можна будзе скарыстаць іх яшчэ для насенаачышчэньня.

Апрача ўжо атрыманых 10 трактараў, да 20-га красавіка мае быць атрымана яшчэ 15 трактараў саюзнай вытворчасьці.

Па часьці загатоўкі насеньня лубіну па лініі Цэнтраземскладу можа быць максімум загатоўлена 8-10 тыс. пуд.

Прадстаўнік КСУ нічога ня даў канкрэтнага аб ходзе загатовак і падрыхтоўкі да сяўбы па ўсёй сыстэме сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі, бо з месц няма жадных вестак. Самыя пазьнейшыя весткі атрыманы 15-га сакавіка, але яны фактычна нічога не даюць новага.

Нарада адзначыла, што ў плянавых меркаваньнях округ няма ўстойлівасьці, на працягу загатоўчага сэзону акругі мяняюць свае папярэднія заяўкі. У мэтах зьнішчэньня гэтых недахватаў нарада запрапанавала Наркамзему даць акругам належныя дырэктывы аб складаньні загатоўчых плянаў з восені.

З другога боку нарада адзначыла, што загатавіцелі: Цэнтрасаюз, Хлебапрадукт і Хлебацэнтр адгрузілі шмат аўсу не належнай кандыцыі; гэта выклікае неабходнасьцьачысткі, што зьмяншае нашы пасяўныя рэсурсы. Апроч таго, спазьненьне адгрузкі насеньня па лініі Цэнтрасаюзу і Хлебацэнтру ўскладняе дастаўку на месца насеньня з прычыны вясеньняга бездарожжа.

Нарада пастанавіла прасачыць і праверыць, каб дырэктывы ўраду аб пашырэньні пасяўнога плошчу наогул і паасобных культур, праз удасканаленьне ў гаспадарчае карыстаньне мэліяраваных зямель, аблогаў, раскарчовак і скарачэньня папару, былі выкананы на ўсе 100 проц.

Цэнтраземскладу запрапанавана забясьпечыць патрэбнасьць трактарных гаспадарак запаснымі часткамі да трактараў. З другога боку, зьвернута ўвага Наркамгандлю на забясьпечаньне трактарных гаспадарак патрэбнымі змазачнымі і гаручымі матар'яламі.

Нарада пастанавіла прасіць Наркамгандлю БССР яшчэ раз паставіць перад Наркамгандлем СССР пытаньне аб завозе інвэнтару па малочнай гаспадарцы, у прыватнасьці сэпаратараў, у якіх надзвычайна востра адчуваецца недахват.

У сувязі з арганізацыяй штучнай пашы Белсельсаюзу запрапанавана завезьці насеньне лугавых траў да плянавых меркаваньняў.

ШТО РЫХТУЕ ДА СЯЎБЫ БАРЫСАЎШЧЫНА.

У агульным загатоўлена па Барысаўскаму раёну: льнянага насеньня—150 проц., аўса—80 проц., ячменю—100 пр., канюшыны—95 пр. гароднага насеньня—100 пр., суперфасфату—70 пр., лубіну—70 пр., вікі—125 пр. Зембінскае таварыства загатовіла: аўса—40 проц., ячменю—35 проц., канюшыны—50 проц., вікі—100 проц., сэрадэлі—40 проц., гароднага—100 пр. Камітэт сялянскае ўзаемадапамогі—50 проц. усяго насеньня. Даныя лічбы ўзяты ў адносінах да ўсяго пляну загатовак.

У земляўпарадкаваемых сельсаветах намечана арганізаваць 1-2 сельскагаспадарчыя калектывы. Пры іх павінны быць закладзены камунальныя сады, гароды паказальныя, малочныя, птушнікі і г. д.

На шматпольле намечана перавесьці ў 1928 г. 2142 гект. зямлі ў 6 вёсках.

Замест меркаваных да ачысткі 25 пр. насеньня ў колькасьці 32.170 пуд., зза кепскага стану зерноачышчальных машын будзе ачышчана 15 проц. Усяго будуць працаваць 24 машыны.

Павялічана будзе плошча пасеву з мінэральнымі ўгнаеньнямі з 3168 гект. у леташнім годзе да 3231 гектара ў 1928 г.—у агульным на 2 проц.

Агульная пасяўная плошча будзе павялічана з 32630 гектараў да 33282 гектараў, г. зн. на 2 проц. Па асобных культурах намечана павялічэньне: лёну—на 18 проц., бульбы—8,3 проц. ячменю—3 проц., травы—на 25 проц., кораньплодаў—на 18 проц. Павялічэньня аўса ня будзе.

Для павышэньня с.-г. ведаў сялянскага насельніцтва арганізоўваюцца ў розных мясцох с.-г. курсы і гурткі.

У сяле Рагаткі, Халхалецкага сельсавету, працуюць 2-хмесячныя курсы для сялян, пераходзячых на пасялковае землякарыстаньне пад кіраўніцтвам агранома.

У працягу красавіка і мая арганізуюцца кароткатэрміновыя курсы па садоўніцтву-дзесяцідзёнкі.

Закладаецца ў 17 вясковых сельскагаспадарчых гурткох, пры бядняцкіх і калектыўных гаспадарках—37 паказальных вучасткаў.

Закладаюцца паказальныя гароды ў м. Зембін, Лошніцы і пас. Чапа. Для барацьбы са шкоднікамі распачата кампанія, прыцягваюцца арганізацыі ТДААвіяхіму.

Для ўзьняцьця сельска-гаспадарчага становішча бядняцкае гаспадаркі адпушчана 1000 руб. для набыцьця і разьмеркаваньня між беднякамі рабочае жывёлы. І. К.

Па БССР.

Як ідзе самаабкладаньне.

(ПА ВЕСТКАХ НА 15-ае КРАСАВІКА 1928 г.).

АКРУГІ	Заданьне	Прынята на праведзеных сходах	% да заданьня	Паступіла	% да прынятых сумы
Мазырская	210.000	244.690	122,3	159.930	65,4
Аршанская	350.000	350.002	100,0	169.923	48,5
Гомельская	350.000	313.410	89,6	30.595	9,8
Віцебская	250.000	211.960	84,8	33.610	15,9
Полацкая	190.000	153.143	80,6	11.579	7,6
Бабруйская	500.000	373.669	74,7	63.148	16,9
Магілеўская	500.000	294.111	58,8	8.959	3,0
Менская	560.000	302.814	54,1	26.671	8,8
УСЯГО ПА БССР	2.910.000	2.243.799	77,1	504.416	22,9

УВАГА: З прынятых па Гомельскай акрузе 313.410 руб, зацьверджана РВК-амі—224.083 руб.

Самаабкладаньне паступае нездавальняюча.

Па даных Наркамфіну да 15-га красавіка самаабкладаньне па рэспубліцы прынята ў 2.243.799 руб., што складае 77,1 проц. да арыентыровачнай сумы. Паступіла-ж дагэтуль усяго 504.415 руб., ці 22,9 проц. да прынятай сумы. Тэмп паступленьня па самаабкладаньню за апошні тыдзень панізіўся.

Параўнальна здавальняюча ідзе паступленьне ў Мазыршчыне і Аршаншчыне,—першая сабрала 65,4 проц., а другая—48,5 проц. налічанай сумы. Ва ўсіх-жа іншых акругах справа са зборам сродкаў ідзе вельмі і вельмі слаба.

Асабліва кепска стаіць справа ў Магілеўскай, Менскай і Полацкай акругах,—так у Магілеўшчыне паступіла толькі 3 проц., а па Менскай і Полацкай—7-8 проц. прынятых на сходах сум.

Слабы ход кампаніі на самаабкладаньню тлумачыцца, галоўным чынам, тым, што райвыканкомы яшчэ ня досыць добра ўясьнілі сабе ўсю важнасьць гэтага мерапрыёмства. Цікава адзначыць, што на аднэй нарадзе працаўнікоў Полацкага акрфа, якія выяжджалі на месцы для праверкі работы нізавога савецкага апарату ў галіне самаабкладаньня, высьветлілася, што ў многіх выпадках райвыканкомы абмяжоўваюцца агульнымі ўказаньнямі, а ня ставяць пытаньне канкрэтна. З прычыны такіх адносін РВК, на мясцох маецца шэраг направільнасьцяў пры правядзеньні самаабкладаньня. **Да прыкладу ў в. Кашырыны, Савейскага сельсавету, сход вынес пастанову адпрацаваць па самаабкладаньню ўсім жыхарам вескі па 1-у дню. У другім выпадку прынята пастанова аб самаабкладжэньні на патрэбы хаты-чытальні па 20 кап. з кожнай гаспадаркі.** Можна таксама прывесьці шэраг прыкладаў скажэньня дырэктыў па самаабкладаньню,—так, па Сухарукаўскаму сельсавету было пастаноўлена на сродкі самаабкладаньня пабудаваць будынак для сельсавету і шэраг інш. выпадкаў.

Як правіла, можна сьцьвярджаць, што сходы па самаабкладаньню правальваюцца там, дзе не вялася адпаведная падрыхтоўчая праца сярод беднаты, а таксама і ў тых мясцох, дзе выступаюць на сходах з агульнымі сказамі ў міжнародным маштабе аб «пальзвительности» самаабкладаньня, а не гавораць аб патрэбах данай мясцовасьці і вёскі.

Усё сказанае адносіцца ня толькі да Полаччыны, але з упэўненасьцю можна сказаць, што ў тым ці іншым відзе гэтыя выпадкі сустракаюцца і на некаторых другіх акругах.

Мы лічым неабходным адзначыць, што, не зважаючы на шэраг цяжкасьцяў, якія мелі месца пры правядзеньні самаабкладаньня, усё-ж прынятая сходамі па БССР сума ў 2243799 р. дастаткова яскрава даказвае, што барацьба розных клясавых груп у вёсцы навокал пытаньня самаабкладаньня дала перамогу бядняцка-серадняцкаму блёку.

Кулак, які пажадаў адкрыта выступіць супроць мерапрыёмстваў савецкай улады, у тых мясцох, дзе працаўнікам удалося ўскрыць яго шкурніцтва, быў пераможан і беднякі з сераднякамі за ім не пайшлі. Гэтае яшчэ раз падкрэсьлівае для ўсіх працаўнікоў у вёсцы неабходнасьць паглыбленьня працы з сялянскай бяднотой.

10000 РУБ. НА ЖЫЛЬЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Барысаў, 20-4. Сёньня атрымана паведамленьне з Менску аб водпуску 10.000 руб. на крэдытаваньне жыльлёвага будаўніцтва для рабочых шкляного заводу імя «Домбаля».

КРЭДЫТ НА АГНЯТРЫВАЛАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Магілеў, 20-4. Акруговае сельска-гаспадарчае крэдытнае таварыства атрымала гэтымі днямі з Менску 20000 руб. доўгатэрміновага крэдыту на разьвіцьцё агнятрывалага будаўніцтва ў акрузе.

НОВЫЯ КАЛЕКТЫЎНЫЯ АБ'ЯДНАНЬНІ.

Бабруйск, 18-4. За час з кастрычніка месяца на Бабруйшчыне арганізавана 10 калектыўных гаспадарак, 21 малочная арцель, 12 машынных таварыстваў, 1 насённае, 1 пташнікае і 6 іншага роду таварыстваў.

У БІРА-БІДЖАН.

Бабруйск, 18-4. З Бабруйску выехала 30 яўрэйскіх сямей—перасяленцаў у Біра-Біджанскі раён. Сярод перасяленцаў 18 жыхароў гор. Бабруйску і 12 жыхароў акругі.

ПЕРАДВЫБАРЧЫЯ МАХІНАЦЫІ.

РЭПАРАЦЫЙНЫЯ СПРОБНЫЯ КУЛІ.

Можна было чакаць, што прадвыбарчыя кампаніі ў Францыі і Нямеччыне толькі ўкосна закрануць вялікія міжнародныя праблемы, і, між іншым, рэпарацыйную. У абедзьвюх краінах кіруючыя буржуазныя групоўкі і іх верныя збройносцы з згодніцкага стану вельмі вопытныя ў выбарчых справах, каб ня ведаць, якую небясьпеку ўяўляе навігацыя па гэтых мінных палёх, асабліва ў даных канкрэтных абставінах, калі і «трэці задаволены»—Амэрыка—таксама стаіць перад выбарамі. Ясна, што небясьпека ня ў тым, каб «ангажыравацца» перад уласным выбаршчыкам (калі, між іншым, яго не ашукалі?), колькі ў прадчасным выкрыцьці картаў перад Амэрыкаю.

І сапраўды. Сакавікоўскія спрэчкі ў нямецкім і францускім парлямантах, абмен прамоў між Штрэзэманам і Брыянам і распачатая тады дыскусія па рэпарацыйным і рэйнскім пытаньнях абяцалі адносны спакой на час выбарчае кампаніі. Між іншым, вялікую вытрыманасьць выказаў тут нямецкі бок; ён яўна ўхіляўся дражніць і запалохваць францускага выбаршчыка надмернымі выпадамі. Па гэтых-жа меркаваньнях нямецкія выбары і былі назначаны на 20-ае мая, г. зн. пазьней францускіх, бо звычайна нямецкія буржуазныя партыі ўхіляюцца доўгіх выбарчых кампаній.

І дзіўна: нямецкі бок выявіў вялікі спакой яшчэ ў зьвязку з новагодняю справаздачаю Паркера Джільбэрта—генэральнага сэкратара па рэпарацыях. Кіруючыя буржуазныя групоўкі Нямеччыны адмовіліся тады нават ад свайго ранейшага асноўнага патрабаваньня аб канчатковым зафіксаваньні агульнае сумы рэпарацый. Стала ясна, што ў Бэрліне аддаюць перавагу, каб перадаць Францыі ініцыятыву ў гэтым пытаньні. Але і тады, калі Пуанкарэ ў аднэй з сваіх сакавікоўскіх прамоў у Бар-ля-Дзюке выразна напомніў, што на лёнданскай канфэрэнцыі 1921 г. агульная сума рэпарацыйных плацяжоў была вызначана ў 132 мілярды залатых марак, гэтая заява нават ня выклікала абурэньня ў Нямеччыны. Напамінаньне Пуанкарэ было апонена, як манэўр, разьлічаны на тое, каб прымусіць Нямеччыну вызначыць якую небудзь іншую лічбу, хаця-б скажам, тую (50 мілярдаў залатых марак), якую ў свой час прапанавалі трагічна загінуўшыя ад рукі манархічных тэрарыстаў Ратэнау і Эрцбэргер.

Але справа ў тым, што капіталістычна ўзмоцненай Нямеччыне зусім нявыгодна называць якую-б там ні было цьвёрдую лічбу і зафіксаваць яе ў выглядзе дагаворанага абавязацельства. Павуль нямецкая буржуазея плаціць, згодна пляну Дауэса, грашыма нямецкага пралетарыяту, яна можа яшчэ разьлічваць, што ў тых ці іншых міжнародных абставінах, пры далейшым росьце вялікадзяржаўнае ўдзельнае вагі Нямеччыны, пану Штрэзэману ўдасца, можа быць, абмяняць якую-небудзь удалую міжнародна-палітычную камбінацыю на скарачэньне, ці нават на поўнае зьнішчэньне даўсэўскіх плацяжоў.

На імпэрыялістычнай біржы магчымасьць гэтага своеабразнага «таварообмену», далёка ня выключана. Даволі ўспомніць выразны намёк Брыяна ў яго сакавікоўскай прамове ў палаце дэпутатаў на тое, што рэйнская праблема зрабілася праблемаю міжнароднай, г. зн., пачала цікавіць ня толькі Францыю і Нямеччыну, а і іншых, і што яе вырашэньне можа быць пераблытана з пытаньнямі Ўсходняга Лёкарно.

Але, калі-б поўная лічба рэпарацый аказалася зафіксаванай, дык на практыцы гэта азначала-б ня што іншае, як вядомую «камэрцыялізацыю» чыгуначных і дзяржаўных аблігацый, намечаную яшчэ ў Туары ўвосені 1926 г., і разьмеркаваньне аблігацый між вэрсальскімі крэдыторамі Нямеччыны. Але-ж зразумела, што ні Францыя, ні Італія і ні нават Англія ня будуць захоўваць аблігацый у сваіх сэйфах, а распаўсюдзяць іх, як грошы з дапамогаю міжнароднае біржы па ўсяму сьвету, між іншым у Амэрыцы. У гэткіх умовах далейшая спроба Нямеччыны зьменшыць цьвёрда зафіксаваную рэпарацыйную лічбу ўжо выкліча буру з боку трымаўцаў нямецкіх аблігацый, і ўрады прымушаны будуць нажымаць на Нямеччыну.

Усе гэтыя меркаваньні стрымлівалі, нават і сёньня стрымліваюць буржуазныя групоўкі Нямеччыны ад паўтарэньня пачатковых пасьлявэрсальскіх патрабаваньняў аб зафіксаваньні агульнае сумы рэпарацый. Яны-ж яшчэ месяц таму назад радзілі ёй стрыманасьць у агульнай ацэнцы выступленьня Брыяна і Пуанкарэ.

І, аднак, у разгары выбарчае кампаніі абодвы бакі, нібы наперакор свайму жаданьню, далі сябе ўцягнуць у жвавую рэпарацыйную дыскусію. Пачатак зрабіў Пуанкарэ, які ў сваёй праграмнай прамове ў Каркасоне раптоўна забыўся спамянуць аб 132 мілярдах; у Бэрліне гэтую забыўчывасьць выкарысталі, як прычыну для «прынцыповых» размоў.

Ці адзначае гэта, што абодвы бакі сапраўды гатовы распачаць канкрэтную дыскусію па гэтулькі востраму пытаньню?

Зразумела, не малую ролю ў даным ажыўленьні адыграў і такі «аб'ектыўны» факт, як падарожжа Паркера Джыльбэрта ў Парыж і Рым. Нацыяналісцкі нямецкі друк гатоў нават заявяраць, што ўсемагутны агент па рэпарацыях ужо трымае ў партфэлі новы праэкт «камэрцыялізацыі» нямецкіх дзяржаўных аблігацый, а нямецкі міністр фінансаў Келер таксама не выпадкова знаходзіцца ў Рыме і там вядзе перамовы з Мусаліні. Успамінаюць пры гэтым, што ўласна правадыр фашызму яшчэ на лёнданскай канфэрэнцыі 1922 г., якая адбылася непасрэдна перад захопам французамі Руру, выступіў з праэктам злучэньня рэпарацыйнага пытаньня з праблемаю міжсаюзных даўгоў. Але калі нават многа зьменшыць удзельную вагу гэтага заявяраньня, якое, між іншым, знаходзіць водгук і ў Парыжы, усё-ж неабходна будзе прызнаць, што на рэпарацыйнай біржы прыкметна нейкая «тэндэнцыя да павышэньня». Яна выклікана, бясспрэчна, выбарчымі момантамі, патрэбамі партыйнага ўзаемнага азнаямленьня; але характэрнаю яе рысаю зьяўляецца тое, што ўпяршыню ад часоў Вэрсалю, Лёкарно і Туары перад дзесяткамі мілёнаў выбаршчыкаў і Францыі і Нямеччыны, а, галоўнае, перад амэрыканскім выбаршчыкам, вырастае поўная формула ўхіленьня ад усеэўрапейскіх зол—злучэньне рэпарацыйнае праблемы з міжсаюзнымі даўгамі і з датэрміновай эвакуацыяй Рэйну.

З гэтага пункту гледжаньня і нашай савецкай грамадзкай думцы належыць уважліва сачыць за распачатай дыскусіяй. Перад намі прадвыбарчая спробная куля, але куля, маючая значную сувязь з пытаньнямі кантынэнтальнае і ўсходня-эўрапейскае палітыкі.

НОВАЕ АМЭРЫКАНСКАЕ ВЫСТУПЛЕНЬНЕ.

Аб новым амэрыканскім выступленьні можна сказаць, як аб адным з эпізодаў, які выпукла характарызуе ўсё ўзрастаючую актывізацыю палітыкі ўмяшваньня Злучаных Штатаў у эўрапейскія справы.

Зразумела, сьпешнасьць новага выступленьня Кэлёга з праэктам шматбаковага дагавору аб забароне вайны, як сродка нацыянальнай палітыкі, абумоўлена ў значнай меры ўнутрыпалітычнымі момантамі, г. зн. перадвыбарчай сітуацыяй. Канвэнт рэспубліканскай партыі назначан на 6 чэрвеня, а дэмакратычнай—на 15 чэрвеня. Да гэтага тэрміну абедзьве буржуазныя партыі Злучаных Штатаў, і асабліва рэспубліканская, якая стаіць ва ўладзе, павінны быць «духоўна» мабілізаваны для абраньня прэзыдэнта. Гэта значыць, што трэба па думцы выбаршчыка біць зьнянацку, пры дапамозе асабліва пераканаўчых аргумэнтаў. У кожным выпадку, ад рэспубліканскай партыі, якая толькі што асыгнавала законадаўчымі шляхамі праз кангрэс і сэнат вялізарны бюджэт на новае ваенна-марское ўзбраеньне, патрабуюцца тэрміновыя доказы, што яна стаіць за мір, што для захаваньня гэтага міру яна, у духу амэрыканскай дэлавітасьці, выступае з канкрэтнымі прапановамі без усялякіх лішніх хітрасьцяў. Неабходнасьць у гэтым тым больш відавочна, што, як мы памятаем, усяго месяц таму назад паўночна-амэрыканская дэлегацыя на жэнеўскай падрыхтоўчай камісіі па разброеньню супольна з іншымі капіталістычнымі дзяржавамі і без асаблівых «ваганьняў духу» рашуча адхіліла наш савецкі праэкт канвэнцыі аб поўным і ўсеагульным разброеньні. Адгэтуль—сьпешнасьць новага выступленьня Кэлёга. Выбаршчыку трэба растлумачыць, яго трэба пераканаць, што рэспубліканская партыя забясьпечвае мір ня толькі Злучаным Штатам, але і спакой і дабрабыт у зачумленай Эўропе, якая, атрымаўшы, урэшце, мір з амэрыканскіх рук, акуратна будзе плаціць даўгі і яшчэ больш акуранта процанты па новых пазыках.

Але апроч гэтых унутрыпалітычных (выбарчых) момантаў, у звароце Кэлёга да ўрадаў Англіі, Францыі, Нямеччыны, Італіі і Японіі—трэба ўглядаць таксама пэўны манэўравы крок міжнароднага парадку, ужыты з мэтаю агульнага абмацаваньня Эўропы і разьлічаны на тое, каб ня даць стварыцца ў Эўропе адзінаму «ідэалёгічнаму» фронту ў гэткім важным для Злучаных Штатаў пытаньні аб міжнародных даўгох і рэпарацыях, з далучэньнем сюды праблемы рэйнскай акупацыі і Ўсходняга Лёкарно. Пасьля ажыўленьня выбарчай кампаніі ў Францыі і Нямеччыне; ва ўмовах выклікаючанажымнай палітыкі Мусаліні ў дунайска-балканскім сэктары; у абставінах выключнай актыўнасьці брытанскага імпэрыялізму ва ўсіх нанова намечаных камбінацыях,—іменна ў гэтай «канстэляцыі» паўночна-амэрыканскі капітал павінен насіць у Эўропе падвойныя рагавыя акуляры, каб не апынуцца ў тым няпрыемным становішчы, у якім Вільсон апынуўся ў Вэрсалі.

Амэрыканскаму імпэрыялізму трэба «разабрацца» ў Эўропе, намацаць яе пульс у адносінах адзначанага вышэй адзінага фронту і, калі трэба будзе, зьмяшаць карты тых, хто як, напрыклад, француз Сэйду і яго нямецкія аднадумцы, настойліва даказваюць амэрыканскім міністрам, што толькі поўнае аб'яднаньне рэйнскай праблемы з пытаньнямі аб даўгох і рэпарацыях забясьпечыць Амэрыцы мір у Эўропе і ўкладаньне ў ёй амэрыканскіх мілярдаў. Гэткая пастаноўка праблемы міру нявыгадна для амэрыканскага імпэрыялізму і ён загадзя намячае іншую гульню—гульню па лініі дыплёматычных размоў аб забароне вайны, як сродку нацыянальнай палітыкі.

Мы ня спыняемся тут на дзелавой сутнасьці новай амэрыканскай прапановы; яна яшчэ і невядома падрабязна. Судзячы па першых водгуках цьвёрдалобага «Таймс» і права-буржуазных французкіх газэт, доўгая дыплёматычная валакіта забясьпечана, а разам з ёй забясьпечана і контр-гульня эўрапейскіх партыёраў. Досыць адзначыць тут наступнае пытаньне, пастаўленае брытанскім кансэрватыўным органам: «Адзіная задача, якую дзяржавы павінны

Гэрої грамадзянскай вайны.

Т. т. Дабжынскі Алесь, Зысман Барыс, Мілеўскі Іван, Раўкоўскі Іван, Славінскі Адам і Судакоў у часе грамадзянскай вайны выявілі асаблівую адвагу ў барацьбе з ворагамі рабоча-сялянскай улады. Менскі Гарсавет узьняў хадайніцтва праз урад БССР аб нагароджаньні гэтых асоб да 10-й гадавіны Кастрычніка Ордэнам Чырвонага Сьцягу.

19-га красавіка Менскі Гарсавет на пленуме Савету, ва ўрачыстых абставінах, уручыў Ордэн Чырвонага Сьцягу т. т. Дабжынскаму (рабочы-муляр) і Мілеўскаму (служачы Менскай разьніцы).

Намесьнік старшыні Менскага гарсавету тав. Рабіновіч, вітаючы абіляраў, адзначыў, што Ордэн даецца тым таварышам, якія ў гэрыяд грамадзянскай вайны, калі маладой рабоча-сялянскай уладзе пагражала небясьпека з боку імпэрыялістаў і ўнутраная контррэвалюцыя, не шкадавалі свайго жыцьця, свайго спакою, а адважна змагаліся за клясавыя прынцыпы, за прынцыпы дыктатуры пралетарыяту. Савецкая ўлада не забывае сваіх гэрояў, і РВС і ЦВК СССР наградзілі іх вышэйшай адзнакай пашаны—Ордэнам Чырвонага Сьцягу.

З адказным словам выступіў тав. Мілеўскі, які дзякаваў савецкай уладзе і запэўніў рабоча-сялянскі ўрад, што і ў будучыне рабочыя і сяляне будуць пільна ахоўваць і бараніць інтарэсы пралетарскай дзяржавы і аддадуць усе свае сілы на барацьбу з ворагамі яе.

АБ ЧАРГОВЫХ ПЕРАВЫБАРАХ КІРАЎНІЧЫХ ОРГАНАЎ ЯЧЭЕК І РАЙКОМАЎ КПБ.

УСІМ АКРУГКОМАМ, РАЙКОМАМ І ЯЧЭЙКАМ КП(б)Б.

Дарагія таварышы!

ЦК пастанавіў чарговыя перавыбары кіраўнічых органаў ячэек і райкомаў КПБ правесьці: ячэек з 5 па 25 мая і райкомаў з 25 мая па 15 чэрвеня.

Выходзячы з задач, якія былі высунуты XV-м зьездам УсеКП(б) і XI-м зьездам КП(б)Б, а таксама з агульных вынікаў зіновае працы КП(б)Б, ЦК высоўвае наступныя задачы перад чарговай кампаніяй перавыбараў кіраўнічых органаў ячэек і райкомаў КП(б)Б:

1. Партарганізацыі павінны з усёй увагай падагуліць і праверыць на падставе сваёй практычнай работы, наколькі ўцямлены шырокімі коламі партыйцаў, а таксама ячэйкамі і райарганізацыямі ў цэлым, пастаноў апошніх зьездаў УсеКП(б) і КП(б)Б. Асабліва павінна быць зьвернута ўвага на тое, як упягнуты шырокія масы партыйцаў у практычную работу па ажыцьцяўленьню задач партыі, як пастаўлена работа на ўцягненьню шырокіх колаў працоўных у сацыялістычнае будаўніцтва (гаспадарчае, культурнае і г. д.).

2. Вытворчыя ячэйкі павінны асабліва зьвярнуць увагу на падагульваньне і праверку сваёй працы па паляпшэньню вытворчасьці (рацыяналізацыі, павышэньню вытворчасьці працы, паніжэньню сабекошту, адміністрацыйных выдаткаў і г. д.), на разгортваньню масавай працы на прадпрыёмствах, адпаведна пастановы сакавіковага пленуму (1927 г.) ЦК аб масавай працы і на праверку выкананьня рашэньняў партыі па ўцягненьню рабочых у партыю.

3. Вясковыя ячэйкі павінны зьвярнуць асаблівую увагу на тое, як практычна ажыцьцяўляюцца ячэйкай у цэлым і кожным асобным камуністам вёскі, задача партыі па перабудове сельгаспадаркі на калектыўных началах. Ячэйкі павінны праверыць і падагуліць сваю работу на кааперараваньню сялянскіх гаспадарак, асабліва бедных. Асабліва патрэбна вясковым ячэйкам уважліва падагуліць сваю работу з вясковай беднатой і батрацтвам, выявіць усе недахопы, памылкі і недагляды ў гэтай рабоце ў сэнсе сплачэньня і актывізацыі беднаты і батрацтва і на замацаваньне блёку з серадняцтвам, а таксама ці здолела ячэйка павесьці гэту работу такім чынам, каб даць адпор кулацтву і павесьці бяднякоа-серадняцкі блёк у наступ супроць кулацтва. Таксама [illegible] і ці сваю работу на алмуленьню савецкаў, выявіць вопыт у гэтай рабоце, праверыць сваю работу з беспартыйным актывам.

Паколькі чарговыя перавыбары саўпадаюць з вясенняй пасяўной кампаніяй, ячэйкі павінны дасканальна вучэсьць вопыт сваёй работы па правядзеньню гэтай кампаніі і ў якой меры ячэйка здолела ажыцьцявіць задачы, высунутыя партыяй у гэтую кампанію.

4. Ячэйкі савецкіх і гаспадарчых устаноў павінны асаблівую ўвагу зьвярнуць на тое, як ажыцьцёўлена задача паляпшэньня апарату сваёй установы, як ячэйка змагалася з бюракратычнымі скажэньнямі, што з роблена ячэйкай па рэжыму эканоміі ў сваёй установе, асабліва па паніжэньню адміністрацыйных выдаткаў.

5. Наогул усе ячэйкі павінны выявіць, як яны пасунуліся ў справе ажыцьцяўленьня задач КП(б)Б у галіне нацпалітыкі ў справе ўздыму палітычнага і культурнага ўзроўню.

6. У чарговую кампанію перавыбараў ячэек неабходна, каб ячэйкі праверылі і завастрылі сваю ўвагу на тое, што зроблена і ці была ўвага задачы, якая высунута яскрава XV зьездам УсеКП(б)—„энэргічнай барацьбы за рашучую перабудову быту, барацьбы за культуру, супроць п'янства, за настойлівае зьліквідаваньне непісьменнасьці, за працоўную сьвядомасьць і працоўную дысцыпліну рабочых і сялянскіх мас".

Падрыхтоўка і перавыбары парторганаў павінны быць праведзены пад наступнымі асноўнымі момантамі:

а) Поўнае захаваньне ўнутры-партыйнай дэмакратыі, шырокае разгортваньне дзелавой крытыкі і самакрытыкі, выяўленьне ўсіх дасягненьняў у рабоце з мэтай іх замацаваньня, рашучае выяўленьне ўсіх недахопаў, памылак і недагляджэў з мэтай іх выпраўленьня.

б) Ячэйкі і РК павінны зьвярнуць увагу на рацыяналізацыю сваёй працы, каб палепшыць якасьць сваёй работы, упягнуць у работу ўсіх партыйцаў. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць пытаньням паляпшэньня сваёй працы, падагуліць вопыт плянавай працы (як складаліся пляны, адпаведнасьць плянаў тым вузлавым пытаньням, якія стаялі перад ячэйкай у сувязі з рашэньнямі зьезду УсеКП(б) і КП(б)Б, як выкананы пляны і г. д.).

в) Таксама ячэйкі і РК павінны ў час перавыбараў падлічыць вынікі сувязі з вышэйстаячымі парторганамі, ці дастаткова была дапамога ў працы з боку вышэйшых партарганізацый, ці адпавядала яна па якасьці і што трэба ў гэтай галіне зрабіць, каб магчыма было атрымліваць сапраўдную практычную дапамогу з боку вышэйстаячых органаў у сваёй рабоце.

г) Падабраць яшчэ больш вытрыманых і працаздольных кіраўнічы склад ячэек і райкомаў, абнавіць яго ў разьмерах неабходнасьці, павялічыць удзельную вагу рабочых і батракоў, упягнуць больш жанчын у кіруючы склад.

д) Вытворчыя ячэйкі павінны зьвярнуць увагу на прыцягваньне к удзельнічаньню камуністых кастрычнікавага закліку ў перавыбарах, растлумачыўшы ім значэньне перавыбараў у жыцьці партыі.

е) У чарговых перавыбарах ячэек неабходна захаваць і пашырыць мэтады падрыхтоўкі перавыбараў, якія апраўдалі сябе ў шэрагу мінулых перавыбараў (самаправерачныя камісіі, камісіі па падагульваньню рабочых ячэек і г. д.).

ж) Акругкомы і РК павінны заблаговрэмянова ўзяцца за перавыбарную кампанію сапраўднае інструктаваньне і практычную дапамогу ячэйкам у падрыхтоўцы перавыбараў (дапамагаючы ячэйкам у выяўленьні іх дасягненьняў, недахопаў, дапамагаючы ячэйкам у падшуканьні мэтадаў падрыхтоўкі кандыдатур, мэтадаў разгортваньня актыўнага ўдзелу ўсіх партыйцаў у перавыбарах шырокай крытыкі і самакрытыкі).

ЦК зьвяртае ўвагу ўсіх АК і РК на неабходнасьць своячасовага падагульваньня вынікаў перавыбарнай кампаніі, прычым АК і РК павінны выявіць агульныя слабыя месцы ў рабоце ячэек і РК, выявіць наяўныя слабыя працоўныя ячэйкі і РК з тым, каб прыняць адпаведна неабходныя меры.

У выніку правядзеньня чарговых перавыбараў парторганаў партарганізацыі павінны стаць яшчэ больш ленінскі-бальшавіцкі згуртаванымі і падрыхтаванымі да пасьпяховага ажыцьцяўленьня тых вялізных задач, якія стаяць перад партыяй і пралетарыятам наогул і перад КП(б)Б у прыватнасьці.

Сэкратар ЦК КП(б)Б ВАСІЛЕВІЧ.

ЦІ БУДЗЕ ВЫКАНАН ПЛЯН БУДАЎНІЦТВА Ў МЕНСКУ.

Будаўнічыя работы ў Менску на гэты сэзон разьлічаны ў 10,5 міліёнаў руб.—Камгас ня мае ўпэўненасьці, калі паасобныя арганізацыі пачнуць будаўніцтва, бо некаторыя пляны і праэкты яшчэ не гатовы.

19 красавіка адбыўся чарговы пленум Менскага Гарсавету, на якім былі заслуханы даклады т. т. Нахільніцкага і Шчэцько аб пляне будаўнічых работ па гор. Менску на бягучы год.

Будаўнічыя работы гэтага лета зьяўляюцца працягам пляну будаўніцтва, намечанага па пяцігадовым пляну адбудовы гораду. Гэта—буйныя работы, якія характарызуюць рэканструкцыю нашай камунальнай гаспадаркі. Па незакончаных яшчэ падліках будаўнічыя работы сёлетняга сэзону будуць каштаваць да 10 з палов. міліёнаў руб., што дае павялічэньне, у параўнаньні з мінулым годам, на 35 проц. Сюды ўваходзяць: пабудова Унівэрсытэцкага Гарадка, дому на 75 кватэр, пракладка на 15 кілёмэтраў каналізацыі, пракладка на 6 з палов. кілёмэтраў трамвайнага шляху, пабудова Цэнтральнай Малочнай, пабудоўка ф-кі «Миншвея» і Белмэдгандлю, Белжылсаюзам дому на 40 кватэр, працяг будаўніцтва дому Камунальнага Банку, Цэнтральнага Дому Селяніна, халадзільніка, жалеза-бэтоннага маста, клінікі па нэрвовых хваробах, клюбаў саюзу харчавікоў і металістаў і інш.

З усёй сумы ў 10 з палов. міліёнаў руб., якое сёлета будзе затрачана на будаўніцтва, 900 тысяч руб. пойдзе на жыльлёвае будаўніцтва.

Адмоўным момантам у справе падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону зьяўляецца несваячасовае зрыхтаваньне праэктаў і чарцяжоў. Гэта тлумачыцца тым, што бюджэты зацьвярджаюцца позна, позна вызначаюцца і крэдыты, а пасьля, калі надыходзіць будаўніцтва, трэба вельмі сьпяшацца, што, бязумоўна, адбіваецца на якасьці складаньня праэктаў, а таксама на якасьці ўсяе будаўнічае працы: праўда з плянамі і чарцяжамі ў гэтым годзе ў нас ёсьць значныя посьпехі, аднак яшчэ не гатовы многія пляны і праэкты. Наогул, пляны і праэкты трэба пачынаць складаць за год да пачатку будаўнічага сэзону.

У справе падрыхтоўкі будаўнічых матар'ялаў таксама ня ўсё добра: бракуе цэглы (да 3 міліёнаў штук), дахавага жалеза і жалезных бэлак. Недахват у цэгле сяк-так будзе ліквідаваны, бэлькі, магчыма, будуць заменены рэйкамі, значыць, справа толькі дрэнна стаіць з дахавым жалезам.

Што датычыцца рабочай сілы, то з пачаткам будаўнічага сэзону ў нас будзе адчувацца недахват кваліфікаваных рабочых, асабліва маляроў.

З прычыны браку крэдыту і будаўнічага матар'ялу сёлета будзе значна скарочана прыватнае будаўніцтва, прыблізна, на 40 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Аднак, будуць прыняты належныя меры да вызначэньня пэўных будаўнічых матар'ялаў і для гэтай галіны будаўніцтва.

Балючым пытаньнем зараз зьяўляецца забесьпячэньне гораду здаровай вадой, але прымаюцца захады да палепшаньня гэтай справы.

У абмене думкамі па дакладах прамоўцы адзначалі, што праэкты і пляны будаўніцтва складаюцца несваячасова. Толькі перад самым будаўнічым сэзонам пачынаюць складацца праэкты гэтага будаўніцтва; наогул, ва ўсёй гэтай падрыхтоўцы няма належнай плянавасьці. Камгас добра ведае на вопыце мінулых гадоў, што ў нас бракуе цэглы, аднак, ён ня прыняў належных мер да пашырэньня і мэханізацыі цагельных заводаў.

Камгас да гэтага часу добра ня ведае, якія арганізацыі сёлета прымуць удзел у будаўніцтве. Гэта сьведчыць аб тым, што будаўніцтва носіць стыхійны характар, бяз усякай плянавасьці і жаднай сыстэмы.

Адгэтуль ясна, што нельга гаварыць аб зьніжэньні цэн, аб рацыяналізацыі вытворчасьці і палепшаньні якасьці будаўніцтва, бо яно пачынаецца раптам, не забясьпечана патрэбнымі матар' яламі. Бязумоўна, тут ня будзе паніжэньня і нават можа быць павышэньне цэн.

Пляны, праэкты складаюцца з большага, нягрунтоўна, з прычыны чаго будаўніцтва часта зрываецца. Некаторыя будынкі разбурваюцца на другі год. Дом асьветнікаў, які будуецца на вуліцы Карла Маркса, ужо распаўзаецца. Нам кажуць: гэта глеба пятрывалая. А дзе былі спэцыялісты, калі складаўся праэкт? Яны павінны былі гэтым заняцца, бо яны-ж на гэтым сядзяць.

Калі будаўніцтва пачынаецца 15-га красавіка, то пляны павінны быць гатовы за 2 месяцы да гэтага. А тут на табе ўсё разам: і пляны не гатовы, і матар'ялаў бракуе. З другога боку, у адных арганізацыях ёсьць лішкі будаўнічых матар'ялаў, у другіх зусім іх няма.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што ў справе падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону ў нас ня ўсё добра: няма належнай плянавасьці і сыстэмы, што, бязумоўна, адаб'ецца на якасьці і на кошце будаўніцтва.

Першыя ластаўкі.

(На провадах першай партыі біра-біджанцаў).

Клюб імя Леніна ня мог умясьціць 19 красавіка ўсіх жадаючых папасьці ў яго. Бяз шуму, вельмі скромна, падзелавому ў гэты вечар адбылася падзея вялікай гістарычнай вартасьці, якая з часам павінна стаць паваротным пунктам у гісторыі яўрэйскага народу.

Спраўляць провады пакуль што невялікай жменьцы яўрэяў-перасяленцаў (у складзе 120 чалавек) у далёкі Біра-Біджанскі райён сабраліся беларусы, палякі, расейцы. Справа дабрабыту яўрэйскіх мас аднаўкова дорага і блізка працоўным усіх нацыянальнасьцяй БССР.

Ад імя акругкому і яўсэкцыі ЦК КПБ выступіў т. Ашаровіч, які адзначыў вялікую вартасьць яўрэйскага перасяленьня ў Біра-Біджан.

— У Біра-Біджанскі райён накіроўваюцца адважныя піянэры, прасякнутыя пафасам ідэі дабіцца не пэрсанальнага дабрабыту, а стварыць нармальныя ўмовы для гаспадарчага разьвіцьця многіх з дзесяткаў тысяч людзей «паветра», гэтых тыповых прадстаўнікоў нашага яўрэйскага мястэчка.

Мы ня ўтойваем усіх цяжкасьцяй і перашкод у гэтай справе. Перасяленцам трэба будзе змагацца з суровай прыродай і перамагчы яе, але людзі, якія ня спужаліся першымі рынуцца ў гэты край, справяцца са ўсімі перашкодамі. За вашай будучай работай пільна будуць сачыць тысячы мястэчак, дзесяткі тысяч людзей прагна будуць лавіць кожную вестку аб вашых посьпехах.

Загадчык Менакрэа т. Філатаў, вітаючы перасяленцаў, пажадаў ім перамагчы ўсе цяжкасьці і падрыхтаваць дзікую мясцовасьць пад засяленьне сотняў тысяч перасяленцаў. З адказным словам ад перасяленцаў выступалі: тав. Гохман, Каган, Айзман і інш.

Прэзыдыум Менскага Азэту паднёс перасяленцам сьцяг, а азэтаўскія ячэйкі фабрык, заводаў і ўстаноў паднесьці перасяленцам розныя падарункі.

Учора, 20 красавіка, сваякі і арганізацыі наладзілі на вакзале МБВ адыяжджаючым перасяленцам цёплыя таварыскія провады.

У Эканамічнай нарадзе пры СНК БССР.

(Пасяджэньне за 17 красавіка г. г.).

АБ ЖЫЛІШЧНА-БУДАЎНІЧАЙ КААПЭРАЦЫІ.

Эканамічную Нараду быў заслухан даклад НК РСІ аб выніках абсьледаваньня Белжылсаюзу.

Адзначаўшы, што дырэктывы ўраду па палепшаньні жылішчнага будаўніцтва наогул выконваюцца, Эканамічная Нарада вызначыла цэлы шэраг мерапрыёмстваў для далейшага палепшаньня будаўніцтва, у прыватнасьці: прызнана мэтазгодным, каб Белжылсаюз зрабіў бы рашучыя захады да пераходу ў бліжэйшыя гады да будаўніцтва каменных дамоў, асабліва ў гарадох.

Таксама Эканамічная Нарада пастанавіла абавязаць Белжылсаюз дабіцца патаньненьня будаўніцтва на 15 проц., прычым галоўнымі мерапрыёмствамі для патаньненьня будаўніцтва можа быць ужываньне стандартных частак пабудоў, палепшаньня праэктаваньня, не дапушчаючы непатрэбнай моцнасьці, потым большае ўжываньне ў будынках агульнага тыпу танных будаўнічых матар'ялаў мясцовага паходжаньня, пры эканоміі выдаткаваньня, і скарачэньне накладных выдаткаў.

Дзеля гэтага Эканамічная Нарада запрапанавала Белжылсаюзу ў двухмесячны тэрмін распрацаваць спрошчаную сыстэму папярэдняга падліку кошту будаўніцтва рабочых жылішч, бухгальтарскага і тэхнічнага рахункаводства па будаўніцтву і г. д., прычым Белжылсаюз і акруговыя саюзы павінны рабіць свае будаўніча-фінансавыя пляны адпаведна сапраўднай магчымасьці атрыманьня крэдытаў.

У мэтах бесперапыннай дастаўкі будаўнічых матар'ялаў каапэрацыйным таварыствам, Белжылсаюзу і акруговым саюзам запрапанавана своячасова складаць загатоўчыя пляны, а загатоўку будаўнічых матар'ялаў рабіць цэнтралізавана праз Белжылсаюз, за выключэньнем мясцовых будаўнічых матар'ялаў, напрыклад: цэгла і г. д. Па загатоўцы будаўнічых матар'ялаў трэба іх дастаўляць транзітным шляхам. У прыватнасьці лясныя матар'ялы трэба на будаўніцтва дастаўляць у сухім відзе, дзеля чаго стварыць адпаведныя запасы. Таксама ў мэтах патаньненьня будаўніцтва прызнана неабходным паскорыць правядзеньне ў жыцьцё мерапрыёмстваў па зьбуйненьні жылішчна-будаўнічых і арэндных каапэрацыйных таварыстваў.

Прызнана мэтазгодным, каб Белжылсаюз арганізаваў консультацыі і тэхнічны нагляд за будаўніцтвам.

У інтарэсах павялічэньня будаўніцтва, шляхам упягненьня прыватнага капіталу, Белжылсаюзу і Камунальнаму Банку запрапанавана ў двухмесячны тэрмін распрацаваць формы абслугоўваньня індывідуальных забудоўшчыкаў і ўнесьці на разгляд Эканамічнай Нарады.

Запрапанавана таксама даць больш шырокі доступ у жылішчна-будаўнічую каапэрацыю рабочым і служачым, якія атрымліваюць нізкую зарплату, устанавіўшы градацыю па ўзносу пайвога капіталу і большы тэрмін крэдытаваньня.

Белжылсаюзу запрапанавана ўзмацніць арганізацыйную і інструктарскую работу па абслугоўваньні акруговых саюзаў і паасобных таварыстваў.

Жылішчна-арэндным і будаўнічым каапэрацыйным таварыствам запрапанавана ўзмацніць працу па ўцягненьні жанчын у сябры каапэрацыйных таварыстваў, а таксама і ў сябры праўленьня і даручыць ім адпаведную працу.

АБ ПАРАДКУ КРЭДЫТАВАНЬНЯ БЯДНЕЙШАГА СЯЛЯНСТВА.

Эканамічная Нарада ўстанавіла наступны парадак крэдытаваньня бяднейшага сялянства для куплі маемасьці ў асоб, якія перасяляюцца за межы Рэспублікі, і аплаты перасяленцам арэнды за іх зямлю. На гэтую мэту мяркуецца адпусьціць крэдытаў каля 750 тыс. руб.

Гэтыя пазыкі будуць выдавацца пераважным тым бяднейшым сялянам, якія маюць на мэце арганізаваць на заарэндаваных ад перасяленцаў землях калектыўную гаспадарку, а таксама і калектыўным гаспадаркам, якія арэндуюць у перасяленцаў зямлю і маюць патрэбу ў набыцьці жылых і сельска-гаспадарчых будынкаў.

Пазыкі будуць выдавацца: для куплі ў перасяленцаў жылых і сельска-гаспадарчых будынкаў, а таксама жывога і мёртвага інвэнтару і на сплату перасяленцам арэнды за зямлю, прычым, яны могуць выдавацца альбо на адну з вышэйпаказаных мэтаў, альбо адначасова на абедзьве мэты.

Выдача пазык як калектыўным, так і паасобным гаспадаркам утвараецца ўстановамі с.-г. крэдыту па папярэдняму ўзгадненьню з зямельнымі органамі і камітэтамі сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі.

Разьмер пазыкі на набыцьцё будынкаў і інвэнтару ня можа перавышаць 400 руб., а аплату арэнды за зямлю—100 руб. Такім чынам, агульны разьмер крэдытаў на абедзьве мэты ня можа перавышаць 500 руб. на адну паасобную гаспадарку, альбо на адну сям'ю ў калектыўнай гаспадарцы.

Пазыкі новаўтвараемых гаспадарак, на заарандаваных ад перасяленцаў землях, на куплю будынкаў і адначасова на аплату арэнды за зямлю выдаюцца тэрмінам на 10 гадоў з наступным частковым пагашэньнем: у 4, 5 і 6 годзе па 10 проц., у 7 і 8 годзе па 15 проц. і ў 9 і 10 годзе па 20 проц.

Пазычкі-ж існуючым гаспадаркам на куплю будынкаў і інвэнтару, альбо на адну аплату арэнды за зямлю выдаюцца тэрмінам на 6 гадоў з частковым пагашэньнем: у 3-м годзе—15 проц., 4-м годзе—20 проц., 5-м годзе—30 проц. і 6-м годзе—35 проц.

Крэдыты на гэтыя мэты забясьпечваюцца даўгавымі абавязацельствамі пазычкоўпаў, па асабістых іх закладах маемасьці, набываемай за пазыку, закладам іншай маемасьці альбо паручыцельствам камітэтаў сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, прычым, установа, якая крэдытуе, прызначае ў кожным паасобным выпадку тую ці іншую форму забясьпекі.

АБ КРЭДЫТАВАНЬНІ С.-Г. ТАВАРЫСТВАМІ НЕ НА ВЫТВОРЧЫЯ МЭТЫ.

Эканамічная Нарада прызнала, што крэдытаваньне не на вытворчыя мэты можа ўтварацца толькі выключна за рахунак прыцягнутых на месцы сродкаў у якасьці ўкладаў і гэтае крэдытаваньне можа быць толькі кароткатэрміновым. Процант па гэтых пазыках устанаўляецца ў разьмеры ня вышэй 15 проц. гадовых.

АБ ГРАНІЧНЫМ РАЗЬМЕРЫ КРЭДЫТАЎ БЯДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

Эканамічная Нарада ўстанавіла граничны разьмер крэдыту для індывідуальвай бяднякай гаспадаркі, або для сям'і, якая ўваходзіць у калектыў, у суме 400 руб.

АБ ІНДЫВІДУАЛЬНЫМ РАБОЧЫМ ЖЫЛІШЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

Каб упарадкаваць індывідуальнае (паасобнае) рабочае жылішчнае будаўніцтва, Эканамічная Нарада прызнала мэтазгодным правесьці наступныя мерапрыёмствы: штогодны плян фінансаваньня жылішчнага будаўніцтва, якое робіцца рабочымі і служачымі індывідуальным парадкам для сваіх патрэб, прадугледжваецца агульным плянам крэдытаваньня рабочага жылішчнага будаўніцтва па ўсіх фондах. Дастаўка матар'ялаў індывідуальнаму рабочаму будаўніцтву можа рабіцца Белжылсаюзам і мясцовымі саюзамі жылішчнай каапэрацыі. Будаўніцтва індывідуальным парадкам не дазваляецца на тэрыторыі прамысловых прадпрыёмстваў, а таксама на землях, якія перададзены транспарту.

Доўгатэрміновыя пазычкі індывідуальным забудоўшчыкам з рабочых і служачых, якія будуюць жыльё для сваіх патрэб, выдаюцца Камунальным Банкам на падставе дагавораў з кожным забудоўшчыкам у паасобку, тэрмінам на звыш 10 год, прычым забудоўшчык абавязан укласьці ў будаўніцтва ня менш 30 проц. кошту будуемых будынкаў.

У хадайніцтве аб выдачы пазычкі павінна быць даклада паказана: разьмер пазычкі, разьмер сваіх сродкаў, якія ўкладаюцца ў будаўніцтва, тэрмін скончэньня будаўніцтва і агульны кошт яго, пажаданы для забудоўшчыка тэрмін выдачы пазычкі і разьмер заработнай платы, якую атрымлівае забудоўшчык і члены яго сям'і. Да хадайніцтва трэба дадаць дагавор аб праве забудоўкі і плян будынку, а таксама рахункоўную кніжку з месца службы. На падставе гэтых матар'ялаў будзе вызначацца тэрмін пагашэньня пазыкі.

Адвод зямельных вучасткаў пад індывідуальнае жылішчнае будаўніцтва рабочых і служачых робіцца органамі камунальнай гаспадаркі не пазьней, як у месячны тэрмін з дня падачы заявы. Арэндная плата за гэтыя вучасткі не бяруцца.

У далейшым пастанова датычыцца асобных пытаньняў індывідуальнага рабочага будаўніцтва.

АБ ПЛЯНІРОЎЦЫ ГАРАДОЎ І МЯСТЭЧАК.

У мэтах упарадкаваньня дабрабыту і жылішчнага будаўніцтва гарадоў і мястэчак, а таксама, каб папярэдзіць няправільную забудоўку, якая выклікае немэтазгодныя выдаткі на ўпарадкаваньне, Эканамічная Нарада прыняла пастанову, паводле якой усе гарады і мястэчкі на тэрыторыі БССР павінны мець належным парадкам складзеныя і зацьверджаныя пляны як існуючага разьмяшчэньня сядзібнай часткі гораду або мястэчка, таксама і праэкты перабудовы існуючай сядзібнай часткі або праэкты плянірОўкі пашырэньня данага гораду або мястэчка.

Усе інвоў уьзнікаючыя на тэрыторыі БССР гарадзкія населішчы павінны будавацца ня інакш, як па зацьверджаных ва ўстаноўленым парадку праэктах плянірОўкі, прычым у гэтых праэктах павінны быць адзначаны як першачарговае разьмяшчэньне вуліцы і праездаў, таксама і праэкты далейшага пашырэньня і разьвіцьця данага населішча.

Падрыхтоўка да 1-га Мая.

На апошнім сваім пасяджэньні Сэкратарыят ЦК КП(б)Б абмяркоўваў пытаньне адносна падрыхтоўкі да сьвята 1-га Мая.

У гэтым годзе сьвята 1-га Мая павінна будзе праходзіць пад лёзунгамі—міжнароднай салідарнасьці пралетарыяту і ўпягненьня шырокіх колаў рабоча-сялянскіх мас у сацыялістычнае будаўніцтва, калектывізацыю, каапэрацыю і культурную рэвалюцыю.

Сэкратарыят ЦК зьвярнуў асаблівую ўвагу на тое, каб упягнуць шырокія працоўныя масы ў дэманстрацыі, зьнішчыўшы недахопы мінулага году, як, напрыклад, доўгія зборы, доўгія стаянкі на адным месцы і інш.

Адпаведным органам даручана своячасова выпусьціць палітасьветную літаратуру да сьвята 1-га Мая.

Сярод літоўцаў.

Усебеларуская нарада літоўцаў.

У маі г. д. скліканца ўсебеларуская нарада літоўцаў-камуністаў, працуючых у культурна-асьветных літоўскіх установах.

Сэкцыя літоўскіх пісьменьнікаў.

Пры Менскай філіі ВАПП утворана сэкцыя літоўскіх пісьменьнікаў у колькасьці 6 чалавек. Арганізацыя гэтай сэкцыі дапаможа разьвіцьцю літоўскай пралетарскай літаратуры.

Першы выпуск школы-перасоўкі.

У Аршанскай акрузе нядаўна адбыўся першы выпуск літоўскай школы-перасоўкі. Выпушчана 14 чалавек, з якіх палова дзяўчат.

Выданьне літаратуры.

Літбюро ЦК КП(б)Б вядзе шырокую працу па выданьні літаратуры. Ужо выпушчан літоўскі сьпеўнік, а ў хуткім часе выходзяць з друку сьценаграма ўсебел зьезду літоўцаў, розная антырэлігійная і бэлетрыстыка.

БАЯВЫЯ ЗАДАЧЫ ПЕРАМЕНЬНІКАЎ НАРАДЖЭНЬНЯ 1905 ГОДУ.

Лягерны збор пераменьнікаў нараджэньня 1905 году тэрытарыяльнай дывізіі сёлета пачнецца ў палове мая.

Камандны склад ужо рыхтуецца да прыёму пераменьнікаў, але ў гэтым яшчэ ня ўся падрыхтоўка. Да падрыхтоўкі неабходна далучыць і мерапрыёмствы з боку партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і іншых арганізацый.

Партыйныя органы павінны выканаць дырэктыву ЦК КП(б)Б № 62, якая прадугледжвае ўсе асноўныя мерапрыёмствы да забесьпячэньня збору: арганізацыя яўкі, паведамленьне аб зборы, провады і спатканьне; арганізацыя сходаў разам з вайсковымі таварышамі, льготы, культурнае абслугоўваньне і інш.

Практыка мінулых гадоў паказала, што некаторыя райвыканкомы, сельсаветы і прафэсыянальныя арганізацыі аддавалі гэтым пытаньням мала ўвагі.

Першая і найважнейшая задача з пераменным складам-маладняком—пераход на камандаваньне на беларускай мове. Наша беларуская дывізія—нацыянальная і сёлета ў асноўным канчае поўны пераход на родную мову. Нацыянальныя часьці, як паказвае практыка, па баявой здольнасьці стаяць нараўне з іншымі часьцямі Чырвонай арміі.

Уся страявая і палітычная праца будзе праводзіцца на беларускай мове. Падручнікі і неабходныя вайсковыя статуты для гэтага ёсьць.

Камандны склад, прызначаючы ўсю важнасьць гэтай працы і выконваючы адзін з асноўных пунктаў правядзеньня нацпалітыкі, ужо грунтоўна рыхтуецца да збору.

У галіне палітычна-выхаваўчае працы асноўнай задачай будзе: выхаваньне байца ў напрамку ідэй камуністычнае партыі; выхаваньне байца, які ў поўнай меры ўяўляе задачы савецкае ўлады, байца, гатовага ў любы момант са зброяй у руках выступіць на абарону інтарэсаў працоўных.

Побач з іншым, праграма абавязковых палітычных заняткаў прадугледжвае вывучэньне гісторыі і задач Чырвонай арміі.

У надыходзячым зборы вялікая ўвага будзе зьвернена на ўзмацненьне сувязі Чырвонай арміі з працоўнымі. Наведваньне рабочымі лягераў, экскурсіі чырвонаармейцаў на фабрыкі і заводы будуць дапамагаць узмацненьню сувязі гораду з вёскай і ўяўленьню сялянскім маладняком жыцьця і быту рабочых.

У культурным абслугоўваньні байцоў галоўную ролю павінен будзе адыграць саюз працаўнікоў мастацтва.

У тактычна-страявой вучобе неабходна будзе імкнуцца да таго, каб выхаваць меткага стралка вінтоўкі і кулямёту.

Тэрытарыяльная сыстэма на практыцы паказала, што падрыхтаваць баяздольную часьць мы можам, і камандны і чырвонаармейскі склад прыложыць усе сілы, каб дамагчыся гэтай задачы.

Праверка працы Міліцыі і Крымінальнага Вышуку БССР.

Перад Міліцыяй і Крымінальным Вышукам стаіць адказная задача—змагацца са злачынньнасьцю, з парушэньнем грамадзкага супакою, бараніць правядзеньне рэвалюцыйнай законнасьці, а таксама вартаваць прамысловыя прадпрыёмствы.

Як-жа спраўляюцца органы аховы грамадзкага супакою і парадку з ускладзенай на іх задачаю, якія мэтады ўжыве Міліцыя пры выкананьні сваіх абавязкаў, як яны абслугоўваюць штодзённыя патрэбы працоўнага насельніцтва, ці адпавядае дырэктывам кампартыі і савецкай улады склад гэтых органаў; калі адпавядае, дык у якіх умовах працуюць гэтыя органы?

На ўсе гэтыя і шэраг іншых запытаньняў дае адказ камісія РСІ, якая ў працягу 2 месяцаў дасьледвала працу Міліцыі і Крымінальнага Вышуку БССР. Перш за ўсё карысна спыніцца на тых адмоўнасьцях і недарэчнасьцях, якія выкрыла камісія ў працы міліцыі і Крымінальнага Вышуку, карыстаючыся шырокай дапамогай працоўных.

Аб'ектамі вывучэньня і праверкі ўзяты райёны Аршанскай і Менскай акругаў: Дубровінскі, Дрыбінскі, Койданаўскі і Барысаўскі, а таксама Менскія гарадзкія аддзяленьні і матар'ялы адміністрацыйнай управы НКУС, ахопліваючыя працу міліцыі і Крымінальнага Вышуку ўсёй рэспублікі.

Карыстаючыся ўсім гэтым, знойдзена, што адміністрацыйная ўправа мала пасылае працаўнікоў па акругах і райёнах для абсьледваньня і інструктаваньня. І вось, ня гледзячы на тое, што, напрыклад, у 1927 г. абсьледвана і праінструктавана 5 акругаў, што матар'ялы абсьледваньня скарыстаны цалкам, што кіраўніцтва ажыцьцялялася праз пасылку таварыскіх лістоў, што пасылка цыркуляраў, загадаў і інструкцый, як па колькасьці, так і па якасьці дастатковая і мэтазгодная,—камісія знаходзіць неабходным кожны год рабіць абсьледваньне і інструктаваньне ўсіх акруговых адміністрацыйных аддзелаў.

Існуючы парадак прыняцьця ў шэрагі Міліцыі праз спэцыяльныя прыёмныя камісіі. Камісія лічыць мэтазгодным замяніць прыняцьцем праз нач. адміністрацыйных аддзелаў і іх намесьнікаў.

Плыўкасьць складу органаў Міліцыі і Крымінальнага Вышуку зьяўляецца вынікам матар'яльнай незабясьпечанасьці (34 руб. у месяц), шматкантовасьці і цяжкасьці працы, на якой досыць часта міліцыянэру даводзіцца рызыкаваць здароўем і нават жыцьцём.

Адзначана нездавальняючае культурна-асьветнае абслугоўваньне працаўнікоў Міліцыі і адсутнасьць літаратуры.

Па самаму грунтоўнаму пытаньню дзейнасьці Міліцыі і Крым. Вышуку—узаемаадносінаў Міліцыі з насельніцтвам—азначаецца, што бываюць паасобныя выпадкі, калі міліцыянэры ня вельмі хутка зьяўляюцца дзеля ўтварэньня дазнаньняў, быў выпадак, калі міліцыянэр застрэліў нападаўшага на яго сабаку ў вёсцы, то сям, то там чуюцца скаргі па разнастойных пытаньнях на адносіны працаўнікоў Міліцыі і Крым. Вышуку да нас

„НЕБЯСЬПЕЧНЫ“ ЧАЛАВЕК.

Беларусь спецамі не багата. Мы часта плацім спецам удвойчы, каб яны ехалі толькі да нас працаваць. Такога напрамку, відаць, трымалася і Хлебная Інспэкцыя.

Але кожная «хвароба» мае крызіс. І «хвароба» Хлебнай Інспэкцыі таксама дажыла да крытычнага моманту.

Прынялі на працу спэца—інжынэра Романа. Нічога супроць чалавека ня скажаш, калі ён сумленны. Нават і Хлебная Інспэкцыя супроць Романа нічога не гаварыла, бо як інжынэр—ён добры, як чалавек—таксама, як працаўнік—вельмі сумленны, як вынаходца—гэніяльны.

Інжынэр Роман працаваў. Рыхтаваў сабе зьмену—адваго з работнікаў Хлебнай Інспекцыі. Атрымліваў за працу ўзнагароду.

Пачаўся крызіс. Папершае. Хлебная Інспэкцыя ніяк не магла не «эканоміць», бо шмат хто «эканоміць». Чаму, у такім разе, не зарэжыміць і Хлебнай Інспэкцыі?

Падругое, інжынэр Роман, як ужо відома з артыкулаў нашай газэты аб рабочым вынаходзтве, выдумаў дасканалую прыладу для ўстанаўленьня гатунку і якасьці зярна. Вынаходка аказалася настолькі ўдалай, што СНК Беларусі адпусьціў Роману 500 руб. на канструкцыю вынаходкі, а заграніца пачала прабаваць пераймаць вынаходку да сябе.

— Дык нашто, думае Інспэкцыя, нам такія небясьпечныя людзі? Выдумляе розныя фокусы, атрымлівае субсыдыі на іх ажыцьцяўленьне, заграніцай цікавяцца гэтымі фокусамі і г. д. Возьме яшчэ выдумае прыладу, якою можна будзе адрозьніць працаўнікоў Хлебнай Інспэкцыі ад работнікаў іншых установаў. А тады што? Хоць вазьмі ды Хлебную Інспэкцыю зачыняй—усіх на сонца выведзе. Небясьпечны, вельмі небясьпечны чалавек Роман.

Эх, таварыш Роман, лоўка-ж яны вас на вудачку падлавілі! Дармо, што чалавек вы вынаходлівы, а вось да такой простай рэчы не дадумаліся. Ня ведалі, што пад сябе яму капаеце.

Працавалі і, побач з гэтым, зьмену гатовілі. Вось гэта ўжо ваш асабісты промах. Служачы ў Хлебнай Інспэкцыі, ня варта было так рабіць.

— Цяпер што?

— Роман—чалавек небясьпечны?

— Трэба рэжыміць?

— Трэба.

— Трэба Рэмана скараціць, каб больш нічога ня выдумляў?

— Трэба.

— Замяніць яго ёсьць каму за 90 руб. у месяц?

— Ёсьць.

Ну, дык чаго-ж вам, таварыш Роман, яшчэ хочацца? Усе козыры ў руках установы.

Я, як стары юрыст, кажу, што ніякімі артыкуламі кодэксу законаў аб працы вам ня ўдасца разьбіць довады Хлебнай Інспэкцыі. Можаце быць спакойны.

Па-мойму, вам застаецца адно—даць у газэту абвестку такога зьместу:

«Таленавіты ІНЖЫНЭР РОМАН, які праславіўся сваімі вынаходкамі, ВЫДУМАЎ нязвычайную ПРЫЛАДУ-НАВІНКУ—ШЭДЭЎР СУЧАСНАЙ НАВУКІ І ТЭХНІКІ. НОВАЯ ПРЫЛАДА ІНЖЫНЭРА РОМАНА ДАЕ МАГЧЫМАСЬЦЬ У ПРАЦЯГУ ПЯЦІ ХВІЛІН У НАЙБОЛЬШАЙ УСТАНОВЕ ВЫЯВІЦЬ УСІХ БЮРАКРАТАЎ, якога-б узросту, стану і сацыяльнага становішча яны ні былі“.

Паспрабуйце, таварыш Роман! Быць ня можа, каб гэта не памагло.

СЁМА.

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНТ.

За сапраўдную, а ня „процантную“ беларусізацыю.

СТУДЭНЦТВА ПАВІННА ПРЫНЯЦЬ БОЛЬШ АКТЫЎНЫ УДЗЕЛ У БЕЛАРУСІЗАЦЫІ.

Справа беларусізацыі вышэйшых навучальных устаноў і тэхнікумаў да гэтага часу стаіць не на належнай вышыні і досыць часта мы маем толькі фармальнае правядзеньне гэтага вельмі важнага мерапрыёмства.

Зусім зразумела, што актыўны ўдзел, ініцыятыва і рашучыя мерапрыёмствы з боку самога студэнцтва да правядзеньня беларусізацыі ў нашай вышэйшай школе маюць вялікае значэньне. Толькі пры належнай працы студэнцтва і яго арганізацыі у гэтым напрамку магчыма будзе дабіцца, каб беларусізацыя шырока прасякла ўсё вузаўскае жыцьцё, а ня толькі вылічвалася ў процантах, якія ўводзяць толькі блытаніну. Калі верыць процантам, дык амаль увесь педагагічны факультэт БДУ беларусізаваны, а фактычна... беларуская мова мала ўжываецца; масавая праца вядзецца на расейскай мове, у прыватных гутарках ужываецца расейская мова, даклады і выступленьні на занятках робяцца студэнтамі нават ужо беларусізаваных катэдр не на беларускай мове і г. д. Процанты-ж нам гаворыць, што амаль усё добра.

Гэтымі днямі выйшаў новы нумар № 4—5 унівэрсытэцкай часопісі «Шлях студэнцтва», і ён беларусізаваны толькі на $^2/_3$, а, здаецца, часопісь павінна была-б быць агітатарам у гэтым напрамку.

Нельга сказаць, што мы ня маем у апошні час ніякіх дасягненьняў у сэнсе беларусізацыі—гэта было-б няправільна. Дасягненьні ёсьць, але далёка недастатковыя.

Усебеларуская канфэрэнцыя пралетарскага студэнцтва, якая адбылася ў сакавіку г. г., адзначала, што **беларусізацыя навучальных устаноў праходзіць пры недастатковым удзеле студэнцтва**, з прычыны чаго затрымліваецца яе тэмп; дзеля гэтага канфэрэнцыя паставіла задачу перад стударганізацыямі зьвярнуць значна большую ўвагу з боку студэнцкай масы на справу беларусізацыі і практычна дапамагчы ў ажыцьцяўленьні гэтага.

Шэраг артыкулаў, зьмешчаных у газэце «Савецкая Беларусь», аб ненармальным становішчы ў галіне беларусізацыі ў Белар. Дзярж. Унівэрсытэце і часткова ў Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, выклікалі пастаноўку гэтага пытаньня на пасяджэньні ЦБ пралетстуду ЦСПСБ, якое вынесла ў гэтых адносінах шэраг пастаноў: даручана ўсім студэнцкім прафарганізацыям неадкладна прыняць захады да пераводу масавай працы на беларускую мову, правесьці праверку выкананьня сваіх пастаноў у адносінах беларусізацыі, а таксама дырэктыў вышэйшых органаў; прыцягнуць большую ўвагу студэнцтва да пытаньняў нацыянальнай палітыкі; для завастрэньня грамадзкай студэнцкай думкі на бліжэйшых агульных сходах паставіць і абмеркаваць даклад праўленьня навучальнай установы і стударганізацыі аб выніках правядзеньня беларусізацыі і побач з гэтым шырока асьвятляць гэтую справу ў насьценгазэтах, рашуча выяўляючы ўсе недарэчнасьці на шляху яе правядзеньня.

Усім стударганізацыям БССР запрапанована распрацаваць канкрэтныя мерапрыёмствы для хутчэйшай беларусізацыі штодзённага студэнцкага жыцьця.

Аднагалосна ЦБ пралетстуду адзначыла вельмі цяжкае становішча студэнцтва в падручнікамі на беларускай мове.

Найбольш дрэнна абстаіць справа беларусізацыі ў індустрыяльных і мэдыцынскіх тэхнікумах, студэнцтва якіх павінна асабліва рашуча ўзяцца за пашырэньне і паглыбленьне беларусізацыі.

Шырокая студэнцкая грамадзкасьць прыме ўсе залежачыя ад яе крокі, каб рашуча і ў вызначаныя тэрміны цалкам былі беларусізаваны выш. нав. установы, бо назва нашай вышэйшай школы—беларуская, ня шыльда, а павінна быць сапраўднай.

Львовіч.

Культурнае жыцьцё студэнтаў С.-Г. Акадэміі.

Ва ўмовах такой правінцыі, як Горкі, дзе горад у культурных адносінах задаволіць студэнцтва нічым ня можа, культурная праца стударганізацыі мае асабліва важнае значэньне. Мы знаходзімся на культурным самаабслугоўваньні, г. з., што ва ўсёй культурна-масавай і выхаваўчай працы нам прыходзіцца разьлічваць выключна на свае сілы і сродкі, дзякуючы чаму ўтвараюцца вялікія цяжкасьці ў гэтай галіне працы, асабліва пры той нязначнай дапамозе, якую мы атрымліваем ад прафсаюзу. Мэтавая ўстаноўка культурнай працы—дапоўніць веды студэнта, як будучага спэцыяліста, па пытаньнях, не ўваходзячых у акадэмічны плян. Гэта першае, а другое—арганізаваць разумны здаровы адпачынак і быт студэнта, задачы вельмі важныя, адказныя, бо, выконваючы іх, мы фактычна афармляем культурнага спэцыяліста па перабудоўцы вёскі на сацыялістычны лад, але дзякуючы многім прычынам яны выконваюцца пры надзвычайна цяжкіх умовах. Дзеля прыкладу можна прывесьці такія выключныя факты: мы ня маем клюбу ў Акадэміі (горад ніколькі ня можа абслугоўваць нас клюбам), гурткі займаюцца па розных кутках, ня маем спартыўнай залі, і фізкультурнікі займаюцца ў файэ; тэатру; ня маем студэнцкай асобнай чытальні і чырвонага кутка; ня маем духавога аркестру; ня маем спартівэнтару (на 1.600 студэнтаў маглі закупіць 12 п. лыж і 5 пар канькоў для зімовага спорту), і пры ўсім гэтым прафсаюз (акр. праўленьне с.-г. і лясных рабочых) адпусьціў на культпрацу па каштарысу прафкома 28 р., а пасьля шуму, паднятага прафкомам, 160 р. у год г. з. па 10 к. на студэнта.

Усяго студэнцкіх гуртоў, арганізаваных пры Культкамісіі Прафкому Акадэміі і Рабфаку, налічваецца 17, якія ахопліваюць 938 студэнтаў. Найбольш буйныя гурткі па колькасьці сяброў і па размаху працы наступныя: фото—226 чал., фізкультура—146, драмгурток—72, музычны—55, ш.-шашачны 102, харавы—45. Гурткі ахопліваюць 58,6 проц. студэнцтва. З гэтага відаць, што студэнтаў цікавіць праца па самых розных пытаньнях культурных ведаў. Дзеля прыкладу прывяду той факт, які многіх вельмі здзівіў: увосень з боку некаторых т. т. былі патрабаваньні арганізаваць гурток сьценаграфіі. Абвясьцілі запіс—і запісалася звыш 500 чал. Такі вялікі гурток мы абслужыць не маглі—ня было сіл. Прафгурткі налічваюць 122 чал. Вельмі востры недахоп у працы прафгуртко́ў—гэта адсутнасьць належнай колькасьці прафлітаратуры і навочных прыладаў.

Заўважваецца і гакое зьявішча што ў праф гурткі ідуць не сябры саюзу, бо прафком пры прыёме ў саюз патрабуе наведваньня прафгуртко́ў, (акрамя грамадзкай працы), і як толькі сябра гуртка залічан у саюз, кідае прафгурток. Членаў саюзу ў прафгурткох мала (каля 20 проц.) Гэта—вялікая недарэчнасьць. Працу прафгуртко́ў трэба ажывіць, прыцягнуць да яе як найбольш студэнтаў.

Наведваньне гуртко́ў у сярэднім 64 проц. Заняткаў рознымі гурскамі ўсяго праведзена 340, масавых выступленьняў—24 і два вечары самадзейнасьці.

Адносна культмасавай працы па інтэрнатах трэба сказаць, што дасягненьняў тут няма, а правільной — ніякая праца не вялася, акрамя вечароў у часе Кастрычнікавых урачыстасьцяў. Праўда, у нас інтэрнаты нявялікія ў большасьці (на 4—5 чалавек), а кватэрны крызіс у горадзе не дае магчымасьці арганізаваць чырвоныя куткі ў інтэрнатах.

Не застанаўляючыся падрабязна на ўсіх відах культ. працы ў акадэміі, я хачу адзначыць, што разгарнуць культ.-масавую працу ў Горках неабходна значна шырэй, дзеля чаго трэба: дабіцца ўключэньня ў 5-ці гадовы плян будаўнічых работ акадэміі пабудову студэнцкага клюбу; 2) павялічыць у будучым каштарысным годзе водпуск сродкаў на культ-працу па лініі Праўленьня Акадэміі і прафсаюзу і 3) больш разгарнуць працу па правядзеньні дыспутаў, лекцый, дакладаў, прыцягваючы да гэтага і навукова-культурныя сілы г. Менску.

Я. АГЕЕЎ

ХРОНІКА.

Усебеларуская фінансавая нарада з удзелам вылучэнцаў-сяброў ЦВК БССР.

23 красавіка ў Наркамфіне адбудзецца ўсебеларуская нарада фінансавых працаўнікоў. На нараду запрошаны ўсе вылучэнцы ЦВК БССР і Менскага акрвыканкому. Будуць разгледжаны пытаньні: аб с.-г. падатку на 1928-29 год; праэкт кантрольных лічбаў па складаньні бюджэту на наступны год; дак ад Гомельскага акрфа; даклад падатковага кіраўніцтва НКФ аб становішчы падатковай працы ў рэспубліцы на падставе матар'ялаў рэвізіі 4 акругаў; вынікі рэалізацыі позык і перспэктывы на будучы час.

Кантрактацыя пасеваў.

Белсельсаюз закончыў дагавор з Белсельтрастам на кантрактацыю 3350 гэкт. бульбы, з Белдзяржсьпіртам—на 3250 гэкт. бульбы, а з Белхарчтрэстам—на 1250 гэкт. бульбы, 10000 гэкт. семя лёну і 3000 гэкт. ячменю.

Сьвяткаваньне 100-й пастаноўкі „Кастуся Каліноўскага“.

22 красавіка ў Магілеве адбудзецца сьвяткаваньне 100-й пастаноўкі „Кастуся Каліноўскага“ і 5-хгадовага юбілею аўтара і пастаноўшчыка-рэжысэра БДТ1 т. Міровіча У сьвяткаваньні прымаюць удзел мясцовыя партыйныя і савецкія прафарганізацыі.

Колькі будзе прынята сёлета ў ВУЗ'ы і рабф'кі БССР.

Калегія Наркамасьветы пастанавіла сёлета прыняць у БДУ на ўсе факультэты 395 чал.: у С.-Г. Акадэмію—290 чал., у Ветэрынарны Інстытут—60 чал., у Менскі дзённы рабфак—130 чал. і ў вячэрні—80 чал., у Горацкі рабфак—60 чал., у Гомельскі вячэрні рабфак 80 чал., у Віцебскі рабфак—80 чал., у Дзяржаўны Політэхнікум—135 чал. і ў Магілеўскі павышкольны тэхнікум—80 чал.

УДЗЕЛ ГРАМАДЗКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У АДЧЫНЕНЬНІ ДЗІЦЯЧЫХ ЯСЬЛЯЎ.

Грамадзкія арганізацыі прымуць значны ўдзел у арганізацыі дзіцячых ясьляў. Так, Белкавпасаюз мае арганізаваць у Менскай, Аршанскай, Гомельскай, Бабруйскай і Віцебскай акругах 16 палявых ясьляў.

Сэкцыя Калектыўных Гаспадарак Белсельсаюзу запрапанавала Віцебскаму, Магілеўскаму, Менскаму і Полацкаму акруговым саюзам арганізаваць ясьлі ў калектыўных гаспадарках.

САВЕТЫ САЦЫЯЛЬНАЙ ДАПАМОГІ ПРЫ РАЙЁННЫХ КАНСУЛЬТАЦЫЯХ.

Нар. Кам. Аховы Здароўя БССР запрапанаваў акруговым інспэктурам Аховы Здароўя праверыць працу Саветаў Сацыяльнай Дапамогі пры райённых кансультацыях і арганізаваць іх там, дзе іх яшчэ да гэтага часу няма. З сум Нар. Кам. Аховы Здароўя намечана ажыцьсьціць некаторыя сродкі тым саветам, якія лепш разгарнулі сваю працу і вынялі ініцыятыву па адшуканьні сродкаў на мясцох.

УДЗЕЛ БССР ВА УСЕСАЮЗНЫМ ЗЬЕЗЬДЗЕ НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ.

23-га красавіка ў Маскве адчыняецца першы ўсесаюзны зьезд Усесаюзнай асацыяцыі працаўнікоў навукі і тэхнікі па сацыяльнага вядзеньня гаспадаркі ў гэтых галовых;

з) невыстарчальныя фінансавыя сродкі;

і) адсутнасьць выстарчальнага ліку кваліфікаваных працаўнікоў грамадзкага харчаваньня.

Выходячы з памянёнага і лічучы, што належная пастаноўка грамадзкага харчаваньня можа быць ажыцьцёўлена толькі пры дапамозе каапэрацыі в боку ўсіх працаўленых прафесыянальных, грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Цэнтральная Рабочая Каапэрацыя павінна ўзмацніць сваю працу па грамадзкім харчаваньні, асабліва ў фабрычна-заводзкіх райёнах, у райённых сэзонных і будаўнічых работах, сярод пралетарскага студэнцтва, і пашырыць абслугоўваньне рабочай і вучнёўскай моладзі, вайсковых служачых, а таксама павялічыць водпуск абедаў па хатах.

Лічыць, што сталоўкі, як правіла, павінны самаакупляцца, за выключэньнем сталовак спэцыяльнага прызначэньня (для беспрапоўных, бясьпрытульных дзяцей і інш.). Самаакупляемасьць павінна быць дасягнута шляхам ужыцьця мерапрыёмстваў па зьніжэньні адміністрацыйных выдаткаў, больш рацыянальнай пастаноўкі справы па заготоўцы прадуктаў і інш.

2. Для ўзмацненьня грамадзкага харчаваньня лічыць патрэбным павялічыць маючыйся стаз крэдытны фонд Беларускай Рабочай Сэкцыі Спажывецкае Каапэрацыі з 30.000 руб. да 100.000 руб.

Фонд складаецца:

а) з адлічэньняў з прыбытку цэнтральных рабочых каапэратываў;

б) асигнаваньнем спэцыяльных сум па мясцовым бюджэтам;

в) лічыць магчымым скарыстаньне часткі сродкаў з фонду палепшаньня быту рабочых і служачых на палепшаньне пастаноўкі грамадзкага харчаваньня на прадпрыёмствах.

Беларускай Рабочай Сэкцыі пры Беларускім Саюзе Каапэрацыйных Аб'яднаньняў на працягу месяца ўнесьці ў Эканамічную Нараду пры СНК БССР праз Дзяржаўную Плянавую Камісію пры СНК БССР палажэньне аб утварэньні і скарыстаньні памянёнага фонду.

3. Для палягчэньня капітальнага будаўніцтва па грамадзкім харчаваньні даручыць Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР уключыць у крэдытны плян Беларускага Камунальнага Банку спэцыяльныя крэдыты на рамонт, дапасаваньне і будаўніцтва новых памяшканьняў, а таксама запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам і Народнаму Камісарыяту Фінансаў прадугледжваць, пачынаючы з 1928-29 году, на бюджэтах сталыя сумы на гэту патрабу.

4. Запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі, акруговым выканаўчым камітэтам і Беларускаму Саюзу Жыльлёвай Каапэрацыі пры складаньні плянаў пабудовы новых фабрык і заводаў, рабочых пасёлкаў, буйных дамоў-камун і буйных клюбаў уключаць у гэтыя пляны пабудову адпаведных памяшканьняў для сталовак і чайных.

5. Для больш шырокага развіцьця грамадзкага харчаваньня на фабрыках і заводах лічыць патрэбным, каб гаспадарчыя органы і адміністрацыя заводаў актыўна садзейнічалі справе арганізацыі на іх прадпрыёмствах сталовак і буфэтаў шляхам прадстаўленьня для гэтага і дарэмнае карыстаньне адпаведных памяшканьняў.

6. Лічачы, што галоўнай арганізацыяй у справе разьвіцьця грамадзкага харчаваньня зьяўляецца Цэнтральная Рабочая Каапэрацыя, прызнаць патрэбным пашырэньне на адпаведныя яе прадпрыёмствы ўсіх льгот, якія ўстаноўлены па грамадзкім харчаваньні для таварыства народнага харчаваньня (Нарпіт).

Тэрмін увядзеньня гэтых льгот устанавіць з 1-га кастрычніка 1928 году.

Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР даручаецца заслухаць даклад упаўнаважанага таварыства народнага харчаваньня (Нарпіт).

7. Для патаненьня грамадзкага харчаваньня, узмацненьня і пашырэньня працы каапэрацыі прыраўняць у адносінах арэндной платы за памяшканьні і за камунальныя паслугі з установамі, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце, тыя каапэрацыйныя сталоўкі і чайныя, якія не ганяюць віном і гарэлкай, прычым, захоўваюць сілу больш льготныя ўмовы ў тых мясцох, у якіх яны ўстаноўлены пастановамі мясцовых саветаў альбо дагаворамі, якія заключаны каапэрацыйнымі арганізацыямі з аддзеламі камунальнай гаспадаркі акруговых выканаўчых камітэтаў.

8. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Цэнтральнай Рабочай Каапэрацыі абмеркаваць пытаньне аб магчымасьці у матах падняцьця кваліфікацыі працаўнікоў сталовак, адчыненьня школы пе[illegible] нары.

9. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя ўзмацніць сані[illegible] нагляд і кантроль за грамадзкім [illegible] ваньнем.

10. Беларускай Сэкцыі і Рабочай [illegible] рацыі разам з Прафэсіянальным С[illegible] Народнага Харчаваньня на працягу [illegible] тыдняў распрацаваць патрэбныя захады [illegible] павышэньня дысцыпліны і падняцьця [illegible] творчасьці працы работнікаў сталовак.

11. Адзначаючы слабы грамадзкі [illegible] троль у галіне грамадзкага харчаваньня [illegible] заапрапанаваць Беларускай Сэкцыі Рабо[illegible] Каапэрацыі пры Беларускім Саюзе Ка[illegible] рацыйных Аб'яднаньняў распрацаваць [illegible] ажыцьцявіць патрэбныя захады у [illegible] напрамку. Камітэту салзейнічаньня [illegible] мадзкаму харчаваньню пры Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР зрабіць [illegible] ныя захады да ўзмацненьня грамадзкага [illegible] контролю.

12. Пры заслуханьні дакладу Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі аб абсьледваньні грамадзкага харчаваньня—адначасна заслухаць даклад Беларускай Сэкцыі Рабочай Каапэрацыі аб выкананьні гэтай пастановы.

Старшыня СНК БССР М. Гая[illegible]

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Шар[illegible]

14 сакавіка 1928 г.

г. Менск.

Законы і загады ўраду БССР.

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

па дакладу Беларускай Рабочай Сэкцыі пры Беларускім Саюзе Каапэрацыйных Аб'яднаньняў аб стане і задачах грамадзкага харчаваньня.

Заслухаўшы даклад Беларускай Рабочай Сэкцыі пры Беларускім Саюзе Каапэрацыйных Аб'яднаньняў аб стане і задачах грамадзкага харчаваньня, Савет Народных Камісараў БССР адзначае ў гэтай галіне некаторыя дасягненьні, якія сказаліся ў пашырэньні ў параўнаньні з мінулым годам сеткі сталовак, асабліва пры фабрычна-заводзкіх прадпрыёмствах і ў некаторым палепшаньні агульнай пастаноўкі працы.

Але адначасна з гэтым Савет Народных Камісараў БССР адзначае агульны незадавальняючы стан грамадзкага харчаваньня, што выяўляецца ў наступным:

а) слаба разгорнута сетка сталовак на фабрычна-заводзкіх прадпрыёмствах, а таксама сярод сэзонных рабочых і вучняў;

б) нявысокая якасьць і адналтайнасьць а'едаў, маладаступны кошт іх, а таксама недапасаваньне абедаў да асобных катэгорый прэпоўных;

в) высокі сабекошт абедаў і вялікія накладныя выдаткі;

г) дэфіцытнасьць сталовак і нездавальняючы санітарны стан іх;

д) невыстарчальная ўвага да справы грамадзкага харчаваньня з боку зацікаўленых арганізацый;

е) нездавальняючая ўнутраная пастаноўка справы ў сталовых;

ж) недапасованасьць памяшканьняў сталовак, што не дае магчымасьці рацыянальнага вядзеньня гаспадаркі ў гэтых сталовых;

з) невыстарчальныя фінансавыя сродкі;

і) адсутнасьць выстарчальнага ліку кваліфікаваных працаўнікоў грамадзкага харчаваньня.

Выходячы з памянёнага і лічучы, што належная пастаноўка грамадзкага харчаваньня можа быць ажыцьцёўлена толькі пры дапамозе каапэрацыі в боку ўсіх працаўленых прафесыянальных, грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Цэнтральная Рабочая Каапэрацыя павінна ўзмацніць сваю працу па грамадзкім харчаваньні, асабліва ў фабрычна-заводзкіх райёнах, у райённых сэзонных і будаўнічых работах, сярод пралетарскага студэнцтва, і пашырыць абслугоўваньне рабочай і вучнёўскай моладзі, вайсковых служачых, а таксама павялічыць водпуск абедаў па хатах.

Лічыць, што сталоўкі, як правіла, павінны самаакупляцца, за выключэньнем сталовак спэцыяльнага прызначэньня (для беспрапоўных, бясьпрытульных дзяцей і інш.). Самаакупляемасьць павінна быць дасягнута шляхам ужыцьця мерапрыёмстваў па зьніжэньні адміністрацыйных выдаткаў, больш рацыянальнай пастаноўкі справы па заготоўцы прадуктаў і інш.

2. Для ўзмацненьня грамадзкага харчаваньня лічыць патрэбным павялічыць маючыйся стаз крэдытны фонд Беларускай Рабочай Сэкцыі Спажывецкае Каапэрацыі з 30.000 руб. да 100.000 руб.

Фонд складаецца:

а) з адлічэньняў з прыбытку цэнтральных рабочых каапэратываў;

б) асигнаваньнем спэцыяльных сум па мясцовым бюджэтам;

в) лічыць магчымым скарыстаньне часткі сродкаў з фонду палепшаньня быту рабочых і служачых на палепшаньне пастаноўкі грамадзкага харчаваньня на прадпрыёмствах.

Беларускай Рабочай Сэкцыі пры Беларускім Саюзе Каапэрацыйных Аб'яднаньняў на працягу месяца ўнесьці ў Эканамічную Нараду пры СНК БССР праз Дзяржаўную Плянавую Камісію пры СНК БССР палажэньне аб утварэньні і скарыстаньні памянёнага фонду.

3. Для палягчэньня капітальнага будаўніцтва па грамадзкім харчаваньні даручыць Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР уключыць у крэдытны плян Беларускага Камунальнага Банку спэцыяльныя крэдыты на рамонт, дапасаваньне і будаўніцтва новых памяшканьняў, а таксама запрапанаваць акруговым выканаўчым камітэтам і Народнаму Камісарыяту Фінансаў прадугледжваць, пачынаючы з 1928-29 году, на бюджэтах сталыя сумы на гэту патрабу.

4. Запрапанаваць Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі, акруговым выканаўчым камітэтам і Беларускаму Саюзу Жыльлёвай Каапэрацыі пры складаньні плянаў пабудовы новых фабрык і заводаў, рабочых пасёлкаў, буйных дамоў-камун і буйных клюбаў уключаць у гэтыя пляны пабудову адпаведных памяшканьняў для сталовак і чайных.

5. Для больш шырокага развіцьця грамадзкага харчаваньня на фабрыках і заводах лічыць патрэбным, каб гаспадарчыя органы і адміністрацыя заводаў актыўна садзейнічалі справе арганізацыі на іх прадпрыёмствах сталовак і буфэтаў шляхам прадстаўленьня для гэтага і дарэмнае карыстаньне адпаведных памяшканьняў.

6. Лічачы, што галоўнай арганізацыяй у справе разьвіцьця грамадзкага харчаваньня зьяўляецца Цэнтральная Рабочая Каапэрацыя, прызнаць патрэбным пашырэньне на адпаведныя яе прадпрыёмствы ўсіх льгот, якія ўстаноўлены па грамадзкім харчаваньні для таварыства народнага харчаваньня (Нарпіт).

Тэрмін увядзеньня гэтых льгот устанавіць з 1-га кастрычніка 1928 году.

Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР даручаецца заслухаць даклад упаўнаважанага таварыства народнага харчаваньня (Нарпіт).

7. Для патаненьня грамадзкага харчаваньня, узмацненьня і пашырэньня працы каапэрацыі прыраўняць у адносінах арэндной платы за памяшканьні і за камунальныя паслугі з установамі, якія знаходзяцца на дзяржаўным бюджэце, тыя каапэрацыйныя сталоўкі і чайныя, якія не ганяюць віном і гарэлкай, прычым, захоўваюць сілу больш льготныя ўмовы ў тых мясцох, у якіх яны ўстаноўлены пастановамі мясцовых саветаў альбо дагаворамі, якія заключаны каапэрацыйнымі арганізацыямі з аддзеламі камунальнай гаспадаркі акруговых выканаўчых камітэтаў.

8. Даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы і Цэнтральнай Рабочай Каапэрацыі абмеркаваць пытаньне аб магчымасьці у матах падняцьця кваліфікацыі працаўнікоў сталовак, адчыненьня школы пе[illegible] нары.

9. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Аховы Здароўя ўзмацніць сані[illegible] нагляд і кантроль за грамадзкім [illegible] ваньнем.

10. Беларускай Сэкцыі і Рабочай [illegible] рацыі разам з Прафэсіянальным С[illegible] Народнага Харчаваньня на працягу [illegible] тыдняў распрацаваць патрэбныя захады [illegible] павышэньня дысцыпліны і падняцьця [illegible] творчасьці працы работнікаў сталовак.

11. Адзначаючы слабы грамадзкі [illegible] троль у галіне грамадзкага харчаваньня [illegible] заапрапанаваць Беларускай Сэкцыі Рабо[illegible] Каапэрацыі пры Беларускім Саюзе Ка[illegible] рацыйных Аб'яднаньняў распрацаваць [illegible] ажыцьцявіць патрэбныя захады у [illegible] напрамку. Камітэту салзейнічаньня [illegible] мадзкаму харчаваньню пры Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР зрабіць [illegible] ныя захады да ўзмацненьня грамадзкага [illegible] контролю.

12. Пры заслуханьні дакладу Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскае Інспэкцыі аб абсьледваньні грамадзкага харчаваньня—адначасна заслухаць даклад Беларускай Сэкцыі Рабочай Каапэрацыі аб выкананьні гэтай пастановы.

Старшыня СНК БССР М. Гая[illegible]

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Шар[illegible]

14 сакавіка 1928 г.

г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ САВЕТА НАРОДНЫХ КОМИССАРОВ БССР

по докладу Белорусской Рабочей Секции при Белорусском Союзе Кооперативных Об'единений о состоянии и задачах общественного питания.

Заслушав доклад Белорусской Рабочей Секции при Белорусском Союзе Кооперативных Об'единений о состоянии и задачах общественного питания, Совет Народных Комиссаров БССР отмечает в этой области некоторые достижения, которые выразились в расширении в сравнении с предыдущим годом сетки столовок, особенно при фабрично-заводских предприятиях и в некотором улучшении общей постановки работы.

Но одновременно с этим Совет Народных Комиссаров БССР отмечает общее неудовлетворительное состояние общественного питания, что выражается в следующем:

а) слабо развернута сетка столовок на фабрично-заводских предприятиях, а также среди сезонных рабочих и учащихся;

б) невысокое качество и однообразие обедов, малодоступная цена их, а также неприспособленность обедов к отдельным категориям трудящихся;

в) высокая себестоимость обедов и большие накладные расходы;

г) дефицитность столовок и неудовлетворительное санитарное состояние их;

д) недостаточное внимание к делу общественного питания со стороны заинтересованных организаций;

е) неудовлетворительная внутренняя постановка дела в столовых;

ж) неприспособленность помещений столовок, что не дает возможности рационально вести хозяйство в этих столовках;

з) недостаточные финансовые средства;

и) отсутствие достаточного количества квалифицированных работников общественного питания.

Исходя из упомянутого и считая, что должная постановка общественного питания может быть осуществлена только при помощи кооперации со стороны всех заинтересованных профессиональных организаций, общественных и хозяйственных организаций, Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Центральная Рабочая Кооперация должна усилить свою работу по общественному питанию, особенно в фабрично-заводских райёнах, в районах сезонных и строительных работ среди пролетарского студенчества, и усилить обслуживание рабочей и учащейся молодежи и военнослужащих, а также увеличить отпуск обедов на дом.

Считать, что столовки, как правило, должны самоокупаться, за исключением столовок специального назначения [для безработных, беспризорных детей и др.]. Самоокупаемость должна быть достигнута путем принятия мер по снижению административных расходов, более рациональной постановки дела по заготовке продуктов и др.

2. Для усиления финансовой базы общественного питания, считать необходимым увеличить имеющийся постоянный кредитный фонд Белорусской Рабочей Секции Потребительской Кооперации в 30000 [illegible] до 100000 руб.

Фонд составляется:

а) с отчислений от прибылей центральных рабочих кооперативов;

б) ассигнованием специальных сум [illegible] местным бюджетам;

в) признать возможным использовать [illegible] части средств с фонда улучшения бы[illegible] рабочих и служащих на улучшение кос[illegible] новки общественного питания на предпр[illegible] ятиях.

Белорусской Рабочей Секции при Бе[illegible] русском Союзе Кооперативных Об'единен[illegible] в месячный срок внести в Экономическо[illegible] Совещание при СНК БССР через Го[illegible] дарственную Плановую Комиссию при С[illegible] БССР положение о создании и использо[illegible] вании указанного фонда.

3. Для облегчения капитального стр[illegible] тельства по общественному питанию, пору[illegible] чить Экономическому Совещанию при С[illegible] БССР включить в кредитный план Бе[illegible] русского Коммунального Банка специальн[illegible] кредиты на ремонт, приспособление и стр[illegible] ительство новых помещений, а также пре[illegible] ложить окружным исполнительным комит[illegible] тетам и Народному Комиссариату Фина[illegible] предусмотреть, начиная с 1928-29 года, [illegible] бюджетам постоянные суммы на эту це[illegible]

4. Предложить Высшему Совету Нар[illegible] ного Хозяйства, окружным исполнитель[illegible] комитетам и Белорусскому Союзу Жиль[illegible] ной Кооперации при составлении пла[illegible] постройки новых фабрик и заводов, раб[illegible] чих посёлков, больших домов-коммун вк[illegible] чить в эти планы постройку соответству[illegible] щих помещений для столовых и чайных.

5. Для более широкого развития об[illegible] ственного питания на фабриках и заво[illegible] считать необходимым, чтобы хозяйствен[illegible] органы и администрация заводов акти[illegible] содействовали делу организации [illegible] их предприятиях столовых и буфетов [illegible] тем предоставления для этой цели в б[illegible] платное пользование соответствующих п[illegible] мещений.

6. Считая, что главной организацией [illegible] деле развития общественного питания яв[illegible] ется Центральная Рабочая Кооперац[illegible] признать необходимым распространение [illegible] ее предприятия всех льгот, установлен[illegible] по общественному питанию для общес[illegible] народного питания (Нарпит).

Срок введения этих льгот установить [illegible] 1 октября 1928 года. Экономическому Со[illegible] вещанию при СНК БССР поручается за[illegible] слушать доклад Уполномоченного Обществ[illegible] Народного Питания (Нарпит).

7. Для улешевления общественного пи[illegible] тания, усиления и расширения работы кооп[illegible] перации приравнять в отношении арендн[illegible] ной платы за помещение и за коммунальны[illegible] услуги с учреждениями, находящимися [illegible] государственном бюджете, те кооперативные столовки и чайные, которые не торгуют вином и спиртными напитками, при[illegible] чем остаются в силе более льготные усл[illegible] вия в тех местах, где таковые установл[illegible] ны постановлениями местных советов и[illegible] договорами, заключенными кооперативны[illegible] организациями с отделами коммунального хозяйства окружных исполнительных комитетов.

8